WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

29 КАСТРЫЧНІКА 2009 г. ЧАЦВЕР № 205 (26563)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Парламенцкі дзённік

## САЦЫЯЛЬНЫ ВЕКТАР — ЯК ЗАЎЖДЫ МОЦНЫ

**— Функцыянаванне нацыянальнай эканомікі сёлета адбывалася ў няпростых умовах уплыву сусветнага фінансавага крызісу, — канстатаваў, выступаючы ў Авальнай зале падчас сумеснага пасяджэння дзвюх палат парламента віцэ-прэм'ер Уладзімір ПАТУПЧЫК. — Рэзкае зніжэнне дзелавой актыўнасці, узмацненне жорсткасці ўмоў доступу да крэдытных рэсурсаў. Аднак Беларусь да нядаўняга часу заставалася адной з нямногіх краін, дзе ВУП працягваў расці.**

Яго прырост за сем месяцаў гэтага года склаў 0,4 працэнтнага пункта. Толькі па выніках студзеня — жніўня зафіксаванае зніжэнне гэтага паказчыка на паўпрацэнта. Па выніках жа дзевяці месяцаў адзначаецца павелічэнне на 0,2 працэнта да папярэдняга месяца.

Дзякуючы своечасова распрацаваным антыкрызісным захадам Беларусі ўдалося пазбегнуць абвальнага падзення вытворчасці ў базавых галінах эканомікі, — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра.

За дзевяць месяцаў гэтага года ў краіне ўведзена ў эксплуатацыю каля 4,5 млн квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў (а гэта на 600 тыс. кв. м больш, чым за аналагічны перыяд летась).

— Павелічэнне аб'ёмаў будаўніцтва жылля вырашае як сацыяльныя, так і эканамічныя задачы, — адзначыў спадар Патупчык, — спрыяе павышэнню дзелавой актыўнасці ў іншых сферах народнай гаспадаркі.

На думку віцэ-прэм'ера, будаўнічая галіна можа стаць лакаматывам росту эканомікі. Колькі слоў сказаў ён і пра аб'ёмы вытворчасці, а таксама пра негатыўную дынаміку росту складскіх запасаў, што змусіла перамясціць акцэнты на збалансаванасць вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі.

Адказваючы на пытанні парламентарыяў, выступоўца паведаміў, што дапамога маці, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, будзе павялічана да памеру БПМ з 1 студзеня 2010 года. Такая прапанова рыхтуецца ў рамках праграмы «Дэмаграфічная бяспека», якая дзейнічае ў краіне. Гэта быў далёка не адзіны дэмаграфічны клопат заканадаўцаў — яны прапануюць давесці дародавы адпачынак жанчынам з 28 тыдняў цяжарнасці, што было ўспрынята віцэ-прэм'ерам пазітыўна.

Сацыяльны пласт у выдатках дзяржавы па-ранейшаму трывалы. У 2010 годзе на дзяржаўную адрасную падтрымку насельніцтва мяркуецца скіраваць 97 млрд рублёў, яе атрымальнікамі стануць каля 300 тыс. чалавек.

Рэальныя заробкі ў бюджэтнай сферы за студзень—верасень гэтага года склалі 100 працэнтаў ад узроўню такога ж перыяду летась. І ўрад арыентаваны на тое, каб павышаць узровень заробкаў бюджэтнікаў у адпаведнасці з пакупной здольнасцю. Віцэ-прэм'ер зрабіў акцэнт на тым, што галоўная задача — захаваць пакупную здольнасць заробкаў.

Сёлета краіне ўдаецца захоўваць сацыяльную скіраванасць бюджэту. На патрэбы аховы здароўя, адукацыі, культуры, СМІ, сацыяльнай абароны, фізічнай культуры, спорту прадугледжваецца бюджэтаваць у гэтым годзе больш як 18 трлн рублёў. У нечым усё ж даводзіцца «падцягнуць паясы» — перад галінамі сацыяльнай сферы стаіць задача атрымаць максімальны эфект ад кожнага ўкладзенага рубля. Налета ўрад плануе забяспечыць прырост выдаткаў на сацыяльную сферу на ўзроўні амаль васьмі працэнтаў да выканання бюджэту гэтага года.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

## Хто што сказаў учора...

**Уладзімір БЕЛАХВОСТАЎ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі** — *пра тое, ці хутка вырастуць паслугі ЖКГ:*

— Думаю, што да канца гэтага года павышэння тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі не адбудзецца, гэтае пытанне разглядалася на пасяджэнні Савета Міністраў і не атрымала падтрымкі.

**Уладзімір ПАТУПЧЫК, намеснік прэм'ер-міністра** — *аб магчымым павышэнні памеру тарыфнай стаўкі першага разраду:*

— Мы разглядаем пытанне аб захаванні пакупніцкай здольнасці заработнай платы. Каб гэта адбылося, як паказваюць разлікі, тарыфную стаўку першага разраду неабходна павысіць з 77 тысяч да 81 тысячы рублёў. Аб тэрмінах пакуль казаць не буду, але цяпер мы над гэтым працуем.

**Сяргей ПЕЛІХ, прафесар кафедры дзяржаўнага рэгулявання эканомікі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар эканамічных навук** — *пра тое, што кожны малы горад Беларусі павінен мець адно-два сучасныя прамысловыя прадпрыемствы:*

— Гэта дазволіць вырашаць найважнейшую для эканомікі краіны задачу па развіцці рэгіёнаў. Актыўнае развіццё вытворчасці ў малых гарадах будзе спрыяць раўнамернаму размеркаванню інтэлектуальнага, эканамічнага патэнцыялу краіны па рэгіёнах. Неабходна даць магчымасць у першую чаргу маладым спецыялістам рэалізаваць свой патэнцыял у рэгіёнах, а гэта дазваляюць зрабіць сучасныя высокаэфектыўныя прадпрыемствы.

**Карла АНЧАЛОЦІ, галоўны трэнер футбольнага клуба «Чэлсі» (Англія)** — *каментуючы «настойлівыя рэкамендацыі» Агенцтва па ахове здароўя Вялікабрытаніі мясцовым футбалістам не плявацца на полі, каб пазбегнуць свінога грыпу:*

— Свіны грып усюды, не толькі на футбольных палях, таму мяне гэта праблема не хвалюе, ад лёсу, як той казаў, не схаваешся. Асабіста ў мяне ёсць адзін добры сродак ад любога грыпу. Гэтаму мяне бабуля навучыла. Трэба піць больш гарачага малака. А яшчэ лепш — чырвонае віно. Лепш за любыя лекі.

**Анатоль КУЛЯШОЎ, міністр унутраных спраў** — *аб магчымай адмене забароны на таніроўку аўтамабільнага шкла:*

— Мы ніколі не зацыкліваемся на нейкай адной пазіцыі, усё змяняецца, у тым ліку і сусветныя тэндэнцыі. Цяпер паступаюць розныя прапановы, у тым ліку пра дазвол таніравання задняга шкла аўтамабіляў. Мы са свайго боку абагульнім усе прапановы і правядзём шырокае абмеркаванне пытання. Думаю, што ў наступным годзе гэта пытанне мы вырашым канчаткова.

## СВЯТЫ ЯН У КРЫНІЧНЫМ КАНЬЁНЕ







*ПАМІЖ вёскамі Чарневічы Глыбоцкага раёна і Сакалоўшчына Міёрскага ў вялізным лясным каньёне б'юць некалькі крыніц. Гэтае месца даўно вядомае як крыніца Святога Яна, і нездарма пасля дазволу на рэлігію, тут была адноўлена капліца, створана адкрытая купель, змайстравана студня. Нягледзячы на тое, што тэрытарыяльна гэтае месца належыць да Глыбоччыны, жыхары Міёршчыны **Аляксандр ШЧАРБІЦКІ** і **Рыгор ДРЫЛА** (на фотаздымку) па ўласнай ініцыятыве дапамагаюць добраўпарадкаваць гэты таямнічы куток Беларускага Паазер'я. Людзей старэйшага пакалення, носьбітаў і захавальнікаў традыцый, крыніца Святога Яна збірае двойчы ў год: сёмага ліпеня, на праваслаўнага Яна Хрысціцеля, і адзінаццатага верасня, на Яна Галавасека. Хоць не засталося жыхароў, якія маглі б патлумачыць, чаму менавіта ў гэтыя дні прынята сюды ісці, крыніца па-ранейшаму збірае на фэсты сотні людзей розных пакаленняў. Драўляную фігуру Святога Яна ў капліцы прынята лічыць духоўнай ахоўніцай глыбоцка-міёрскага крынічнага каньёна. З пашырэннем турызму ў маршруты бліжэйшых аграсядзібаў цяпер абавязкова ўключана наведванне і гэтага месца. «Яно вартае таго, каб са звычайнага ператварыцца ў райскае, — кажуць Аляксандр і Рыгор, — яно адназначна ўнікальнае».*

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ДЭПУТАТ ПАДАЗРАЕЦЦА Ў ПАДЛОГУ

**Як мяркуецца, падначаленыя былога кіраўніка рэспубліканскага прадпрыемства па яго заданні стварылі фіктыўныя дакументы аб вырабе пэўнай прадукцыі і паступленні яе на склад.**

Пад падазрэнне трапіў дэпутат Мінгарсавета 25-га склікання, былы дырэктар рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Прагрэс» Юрый Мікіцкі. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» старшы памочнік пракурора горада Мінска Сяргей Балышаў, у дачыненні да яго заведзена крымінальная справа па частцы другой артыкула 427 Крымінальнага Кодэкса. Дэпутат падазраецца ў службовым падлогу, учыненым з мэтай скажэння звестак дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці. Пытанні да дэпутата ў следства ўзніклі адносна яго дзейнасці па месцы былой працы, гэта значыць, калі падазроны з'яўляўся дырэктарам вышэйзгаданага РУП. У прыватнасці, ён падазраецца ў тым, што даручыў падначаленым падрыхтаваць дакументы аб нібыта вырабе брыкеціруючага прэса коштам 76 мільёнаў рублёў, хоць насамрэч гэтае абсталяванне не было выраблена. Затое звесткі аб вырабе прэса былі пададзеныя ў органы статыстыкі. Паводле звестак Сяргея Балышава, у дачыненні да дэпутата мера стрымання не выбіралася.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### СМЕРЦЬ АД БЕНЗАПІЛЫ

У в. Церабунь Брэсцкага раёна сын з бацькам пілавалі дровы. Падчас працы бензапілой быў смяротна траўмаваны бацька-пенсіянер. Пракуратура вядзе праверку.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

АУКЦИОН

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ОРГПИЩЕПРОМ» (ПРОДАВЕЦ)
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
(ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже **здания гаража и проходной, об.пл. 292 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, д. 44.** Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 321 441 440 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.09.2009 г. Аукцион состоится **06.11.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.11.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
(ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)
ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛЭНЕРГОСТРОЙ» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания склада-навеса, об.пл. 1542,8 кв.м, расположенного по адресу: Минская область, Пуховичский район, г.п. Свислочь, промплощадка Минской ТЭЦ-5. Начальная цена с НДС – 271 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка 0,8394 га. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **01.12.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.11.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

## рЭвалюцыйныя змены?

### Выбарчы кодэкс здадзены на «капрамонт»

**Выбарчае заканадаўства, якое істотна не змянялася апошнія дзевяць гадоў, цяпер, можна сказаць, на парозе рэформы. Прапанаваныя Цэнтрвыбаркамам папраўкі падобныя не на падлатванне таго, што прадзіравілася, а на сапраўдны капрамонт. Яны датычаць прынцыповых момантаў фактычна ўсіх этапаў выбарчай кампаніі. Здаецца, яшчэ нядаўна і гаворкі не магло ісці пра тое, каб даць дабро кандыдатам у дэпутаты і прэзідэнты прыцягваць на сваю агітацыю нейкія дадатковыя сродкі, апроч бюджэтных. Ці пашырыць правы назіральнікаў. Ці спрасціць да немагчымасці афармленне падпісных лістоў, з-за нюансаў якога мноства кандыдатаў на выбарныя пасады «сыходзілі» з дыстанцыі... Сёння гэтыя навацыі нароўні з многімі іншымі сапраўды ініцыююцца Цэнтральнай камісіяй і агучваюцца яе старшынёй Лідзіяй ЯРМОШЫНАЙ. Камусьці застаецца хіба што казаць «ушчыкніце мяне»...**

Прапанаваныя новаўвядзенні ўжо дакладзеныя кіраўніку дзяржавы. Цяпер, закасаўшы рукавы, за работу над беспрэцэдэнтнымі папраўкамі ўзяліся спецыялісты Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў — трэба, каб законапраект паступіў на разгляд парламента ў бягучую сесію. Тады новыя правілы гульні будуць дзейнічаць ужо на найбліжэйшых мясцовых выбарах (падрабязнасці пра гэта чытайце ў адным з наступных нумароў «МС»). Крайні тэрмін правядзення прэзідэнцкіх выбараў, якія, трэба меркаваць, таксама пройдуць па новых канонах, — 7 лютага 2011 года (за два месяцы да заканчэння паўнамоцтваў дзейнага кіраўніка дзяржавы). Калі канкрэтна гэта будзе, вырашыць парламент, і даведаемся мы пра гэта не пазней за 6 лістапада 2010 года.

— Калі праводзіць выбары раней за люты — будуць папрокі, што ўлада распрацавала сцэнар, тэрмін на падрыхтоўку быў скарочаны і апаненты не паспелі падрыхтавацца, — мяркуе **старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.** — Можна гаварыць і пра восень наступнага года. Тады выбары трэба пачынаць летам. А ці гатовы мы да летняй кампаніі? Гэта ўсё ж такі перыяд вельмі вялы. Перыяд як позняй вясны, так і ранняй восені — гэтаксама неспрыяльныя для правядзення выбараў. Зіма ж, наадварот, цудоўны час, у нас жа няма сібірскіх маразоў, якія не дазволяць прыйсці на выбарчы ўчастак...



#### «Мы не чакаем крыку «Ухвалямс!», хоць зрухі і істотныя»

Для саміх зменаў у выбарчым заканадаўстве ёсць чыста тэхнічныя перадумовы: за амаль дзесяцігоддзе з'явіліся новыя нарматыўныя акты, якія варта было б уключыць у кодэкс. Але, бясспрэчна, мае месца і палітычны «рэверанс» у бок АБСЕ.

— Па-першае, наша правапрымяняльная практыка змяняецца, і Цэнтральная камісія вельмі шмат бярэ на сябе, па сутнасці растлумачваючы заканадаўства, часцяком дапаўняючы наяўныя нормы, — адзначае Лідзія ЯРМОШЫНА. — Проста таму што інакш ні арганізатары выбараў, ні кандыдаты, ні выбаршчыкі не змогуць нават узяць удзел у выбарах. Напрыклад, у кожную выбарчую кампанію мы вырашаем, што можа быць заменай пашпарта, калі ў выбаршчыка яго няма. І часцяком нас абвінавачваюць у тым, што мы перавышаем свае паўнамоцтвы. Гэту норму, у прыватнасці, трэба ўдакладніць у Выбарчым кодэксе. Па-другое, з'явіліся некаторыя нарматыўныя акты, якія таксама было б добра, на наш погляд, унесці ў закон.

СТАР. 4

### ДЛЯ ПАСАЖЫРАЎ БЧ ПАЧАЛА ПРАЦАВАЦЬ ГАРАЧАЯ ТЭЛЕФОННАЯ ЛІНІЯ

Па адзіным шматканальным тэлефоне (+375 17) 225 44 77 уважліва выслухаюць скаргі і прапановы па паляпшэнні абслугоўвання пасажыраў у цягніках і на вакзалах беларускай магістралі, дадуць адказы на пытанні. Акрамя таго, прапановы і заўвагі па працы транспартнікаў можна пакідаць таксама на старонцы «Пасажырскія перавозкі» карпаратыўнага сайта Беларускай чыгункі www.rw.by.

**Віктар КУШНАРОЎ, «Мінск—Навіны».**

## ПРА СВАЕ ГРОШЫ ЛЕПШ ЗАЎЖДЫ МАЎЧАЦЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Менш сілаў, ужо значныя праблемы са здароўем, пражыванне асобна ад дзяцей плюс залішняя даверлівасць. Усё гэта разам ці паасобку робіць сваю справу: часта ў непрыемныя сітуацыі трапляюць менавіта пажылыя людзі. Статыстыка сведчыць, што тыя ж пенсіянеры, асабліва восенню-зімой, у значна большай ступені рызыкуюць стаць ахвярамі злачынцаў, пажараў ці выпадковых атручванняў. Але таксама не сакрэт: многіх няшчасных здарэнняў тут проста магло не быць.**

### БАНК. АБО СВАЯКІ

Ці не найбольш распаўсюджаная праблема пажылых людзей — крадзяжы. З кватэр і дамоў пенсіянераў цягнуць літаральна ўсё, ад грошай і ювелірных вырабаў да кухоннага посуду і прадуктаў харчавання. Прычым калі-нікалі злачынцам мімаволі «дапамагаюць» самі старыя грамадзяне. Хтосьці з іх проста забывае ці не лічыць патрэбным зачыніць дзверы перад паходам у краму, нехта без аніякіх сумненняў пускае за парог «медыкаў», «сацыяльных работнікаў», «распаўсюднікаў» тых або іншых тавараў.

— На жаль, пад выглядам урача ці супрацоўніка сацыяльнай службы могуць завітаць нячыстыя на рукі людзі, і такіх выпадкаў — шмат, — кажа **старшы інспектар аддзялення аховы правапарадку і прафілактыкі Крупскага РАУС Сяргей ВАРАБ'ЁЎ.** — Таму ніякіх ваганняў быць не павінна: з'явіўся незнаёмы чалавек — адразу ж запытайце дакументы. Яшчэ лепш пазваніць ва ўстановы, якія «прадстаўляе» госць і пацікавіцца, ці накіроўвалі там у абыход па дамах сваіх супрацоўнікаў. А калі невядомы ў дом усё ж патрапіў, неабходна ўвесь час знаходзіцца з ім у тым месцы, дзе захоўваюцца грошы і каштоўнасці.

Правіла нумар два датычыцца якраз грошай. Хаваць іх у слоіках, каструлях, старой вопратцы ці пад матрацам справа амаль дарэмная. Гэтыя «тайнікі» вядомыя ці не кожнаму. Таму ашчаджэнні, асабліва буйныя, лепш часова «даверыць» надзейным працаздольным сваякам. А ў ідэале «лішнія» сумы трэба аднесці ў банк.

Урэшце нікому, нават блізкім сябрам, нельга расказваць, дзе захоўваюцца грошы і колькі іх патрапіла назбіраць. Рана ці позна гэтыя звесткі проста выйдуць за «вузкае» кола, і магчыма — справакуюць непажаданы візіт.

— Перад тым, як патрапіць у дом, ці не кожны злачынца націсне кнопку званка або пагрукае ў дзверы, аднак можа здарыцца такое: стары чалавек сігналу проста не пачуў, — працягвае Сяргей Вараб'ёў. — І тады адбываецца самае непрыемнае: сутыкненне «вочы ў вочы». Зразумела, аказаць вартае супраціўленне ў такой сітуацыі здольны далёка не кожны пенсіянер, таму перш-наперш трэба памятаць аб галоўным — уласным жыцці. Калі вы ведаеце, што побач нікога няма, то крычаць бессэнсоўна. Лепш не рызыкаваць і аддаць злодзею каштоўнасці. Але пры гэтым неабходна запомніць як мага больш прыкмет злачынцы і пасля яго сыходу тэрмінова выклікаць міліцыю. Бо чым раней адбудзецца выклік — тым больш шанцаў для затрымання.

Дарэчы, зусім нядаўна «гранічныя» тэрміны прыбыцця аператыўнікаў змяніліся і сталі больш сціслымі. Цяпер супрацоўнікі міліцыі павінны з'явіцца на месцы злачынства ў райцэнтры не пазней чым праз 7 хвілін, у населеных пунктах, размешчаных у радыусе да 30 кіламетраў ад райцэнтра, — праз 50, а ў вёсках далей чым за 30 кіламетраў — праз 1 гадзіну 20 хвілін.

### АДЗІН — НЕ ВАРЫЯНТ

Праблемы могуць чакаць і ў, здавалася б, самы прыемны час — дзень атрымання пенсіі. І асабліва ў «ашчадкасах», каля банкаматаў ці аддзялення сувязі. Варыянтаў незапланаванага «развітання» з пенсіяй тут шмат. Злачынца можа пайсці ўслед і пры зручным моманце проста адабраць грошы.

СТАР. 2

### БРАТ І СЯСТРА ЗАХАЦЕЛІ БУЛЬБЫ... ЧУЖОЙ

Брат і сястра з Бярозы адціснулі раму ў акне бульбасховішча ААТ «Бярозаўскі МТС» і выкралі адтуль 70 мяхоў бульбы.

На іх і завялі крымінальную справу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.10.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 733,00 |
| ▼ 1 еўра | 4 050,31 |
| 1 латвійскі лат | 5 703,85 |
| 1 літоўскі літ | 1 171,05 |
| 1 чэшская крона | 153,76 |
| 1 польскі злоты | 951,67 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 93,68 |
| 1 украінская грыўня | 334,93 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 29,1749 |
| UAH | 35,6226 |
| 1000 BYR | 10,7064 |
| EUR | 43,2489 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

Свае думкі

## КЛІЧАЎСКАЯ ТРАДЫЦЫЯ — ПРАЦАВАЦЬ І СЯБЕ ПАВАЖАЦЬ

**Прыемна, калі на пачатку інтэрв'ю суразмоўца кажа, што ён размаўляе, а таксама піша і чытае па-беларуску. Тым больш прыемна, калі гэта кажа кіраўнік раёна.**

**— Я восем гадоў вучыўся ў беларускай школе і добра ведаю родную мову, — пацвердзіў старшыня Клічаўскага райвыканкама Францішак Вітольдавіч ВАШЧЫЛА.**



### *Заходнік у клічаўскіх лясах*

**— Я толькі што чула ў прыёмнай, як вас назвалі Фёдарам Віктаравічам.**

— Ужо 26 гадоў жыву і працую ў Клічаўскім раёне, але маё імя і імя па бацьку сапраўды не вельмі звыклае для гэтых мясцінаў. Таму яшчэ падчас працы ў саўгасе тутэйшыя людзі сталі звяртацца да мяне больш проста.

**— А сапраўды, як чалавек з такім імем апынуўся ў клічаўскіх лясах?**

— Я нарадзіўся на Гродзеншчыне. Пасля тэхнікума і арміі працаваў там у сельскай гаспадарцы. Потым мяне запрасілі ў Бабруйскі раён, затым у Клічаўскі. Я працаваў дырэктарам саўгаса, начальнікам раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі. Меней за год займаю пасаду старшыні райвыканкама.

**— Вы пачыналі на захадзе, цяпер працуеце ва ўсходняй вобласці. Сапраўды заходнікі і ўсходнікі так моцна адрозніваюцца?**

— Цяпер гэта адрозненне нівеліяванае. Псіхалогію чалавека фарміруюць два паняцці: маё і грамадскае. Памятаю, калі ў сярэдзіне 1970-х працаваў начальнікам участка ў калгасе ў Гродзенскім раёне. Гэты калгас на заходніх землях арганізаваўся толькі ў 1950-я гады, там яшчэ толькі адбылася калектывізацыя. І калі на калгасным полі здарыліся праблемы пры пасяўной, да мяне падышоў дзед: «Сынок, дай мне паўмеха збожжа, пайду і сам засею, бо гэта была мая палоска». Такое стаўленне да зямлі як да свайго.

**— Але, можа, і ўсходнікі ў нечым мацнейшыя?**

— Парадаксальна, але тым, што меней чуеш «гэта маё». У нашых людзей ёсць гатоўнасць падзяліцца. І калі на захадзе працуюць за рубель, то тут яшчэ і за ідэю.

**— За ўдзячнасць?**

— За сумленне. Бясспрэчна, сумленне вельмі развітае і ў заходнікаў. Але ўсё ж тут больш калектывізму, чалавечых стасункаў. Хоць разам з тым на захадзе больш шануюць продкаў, бацькоў і кіраўніцтва. Напрыклад, на Клічаўшчыне штогод праводзіцца кампанія добраўпарадкавання могілак. Сельсаветы робяць агароджы, збіраюць апошнія капейкі на прыбіранне. На захадзе людзі ўсё зробяць і без удзелу ўлады. Святар звярнуўся да прыхаджан, і яны выйшлі працаваць.

**— Вы маеце на ўвазе ксяндза, каталіцкую царкву?**

— У тых мясцінах, дзе я вырас, побач мірна стаяць касцёлы і праваслаўныя цэрквы. Каталікі ідуць на свята да праваслаўных, а праваслаўныя — да каталікаў. Чыстых у сэнсе веры сем'яў няма, усе даўно пераржаніліся. Так і тут: я — католік, але вельмі задаволены тым, што ў Клічаве цяпер узводзіцца праваслаўная царква.

### *Прырода і людзі супраць крызісу*

**— Клічаўскі раён — заможны?**

— А што вы маеце на ўвазе? Якое багацце? Калі пра грошы, то — не вельмі. А калі пра прыроду і людзей, то вельмі багаты.

**— Прырода дае магчымасць зарабіць людзям?**

— Так, лясы і балоты даюць зарабіць. Летась больш за 500 тон журавін набылі ў людзей. А таксама чарніцы, лісічкі. Гэта значная прыбаўка да сямейнага бюджэту.

СТАР. 4

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «Высокі ўзровень адукацыі і матэматычнай школы Беларусі прызнаны сусветнай супольнасцю»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам XVII Міжнароднай канферэнцыі Еўрапейскай асацыяцыі «Кенгуру» без граніц».**

Матэматычны конкурс «Кенгуру», які аб'ядноўвае мільёны ўдзельнікаў з розных дзяржаў, — адно з самых масавых інтэлектуальных спаборніцтваў школьнікаў у свеце.

«Юныя беларусы не раз даказвалі сваё першынство на розных матэматычных спаборніцтвах. Правядзенне ў Беларусі такога прадстаўнічага форуму — пераканаўчае сведчанне сусветнага прызнання высокага ўзроўню айчыннай адукацыі і матэматычнай школы», — гаворыцца ў прывітанні.

Прэзідэнт пажадаў удзельнікам форуму, каб работа канферэнцыі была карысная і плённая, а прынятыя рашэнні далі магчымасць выйсці на новы ўзровень міжнароднага супрацоўніцтва ў рабоце з адоранымі дзецьмі і моладдзю.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Беларусь і Расія да канца года павінны прыбавіць ва ўзаемным тавараабароце

**Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы ў Маскве з кіраўніком расійскага ўрада Уладзімірам Пуціным, якая праходзіць у вузкім складзе з удзелам дэлегацый дзвюх краін.**

Сяргей Сідорскі канстатаваў, што цяпер беларуска-расійскі тавараабарот упаў на 42 працэнты ў параўнанні з мінулагоднімі паказчыкамі. Аднак, упэўнены ён, з улікам таго, што ў апошнія тры месяцы ў беларускай і расійскай эканоміках назіраецца тэндэнцыя да паляпшэння сітуацыі, у бакоў ёсць усе магчымасці для нарошчвання ўзаемнага гандлю.

Гаворачы аб парадку дня пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, якое пройдзе пасля двухбаковай сустрэчы, Сяргей Сідорскі адзначыў, што яго парадак дня адпавядае таму ўзроўню адносінаў, які ёсць у Беларусі і Расіі. На пасяджэнні трэба будзе разгледзець каля 25 актуальных пытанняў, якія ахопліваюць важнейшыя напрамкі ўзаемадзеяння.

Доля Беларусі ў знешнім гандлі Расіі павялічваецца апошнім часам. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін у Маскве на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Беларусі Сяргеем Сідорскім, якая праходзіць у пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый.

«Гэта нам вельмі прыемна, і я з задавальненнем канстатую гэты факт», — сказаў Уладзімір Пуцін.

На яго думку, павелічэнне долі Беларусі ў знешнім гандлі Расіі сведчыць аб тым, што, нягледзячы на сусветныя крызісныя з'явы, адносіны паміж Беларуссю і Расіяй прадаўжаюць паспяхова развівацца.

**БЕЛТА.**

## ВЯЛІКАЯ ЦІКАВАСЦЬ ДА ГЛАБАЛЬНАГА ПЛАНА

**Учора ў грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы адбылася прэс-канферэнцыя з нагоды ўдзелу парламенцкай дэлегацыі Беларусі ў рабоце 121-й асамблеі Міжпарламенцкага Саюза на чале са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Нінай МАЗАЙ.**

У час прэс-канферэнцыі была дадзена даволі поўная інфармацыя аб гэтай сустрэчы ў Жэневе 128 парламенцкіх дэлегацый. Але прысутных асабліва зацікавіла паведамленне Ніны Мазай аб яе выступленні на пасяджэнні Першага пастаяннага камітэта па тэме супрацоўніцтва ў глабальнай барацьбе з арганізаванай злачыннасцю, у прыватнасці, з трафікам наркотыкаў, незаконным гандлем зброяй і людзьмі, а таксама з транспамежным тэрарызмам. Яна адзначыла такі красамоўны факт. У свеце штогод выробляецца прыкладна мільён аўтаматаў Калашнікава, і толькі 10 працэнтаў у Расіі. Астатнія 90 працэнтаў — кантрафактная прадукцыя, якая нярэдка выкарыстоўваецца рознымі злачыннымі групоўкамі і незаконнымі баявымі фарміраваннямі.

Ніна Мазай выклала пазіцыю Беларусі па гэтых праблемах. Яна асабліва спынілася на тым, якую ўвагу надае беларуская дзяржава праблеме гандлю «жывым таварам». Яна прапанавала падтрымаць ініцыятыву нашай краіны аб распрацоўцы Глабальнага плана барацьбы з гандлем людзьмі. Дарэчы, многія ўдзельнікі асамблеі, па яе словах, вельмі зацікавіліся гэтай важнай прапановай Беларусі. У дыскусіі на гэту тэму ўзялі ўдзел прадстаўнікі амаль 90 дэлегацый, розных уплывовых міжнародных арганізацый.

Пад старшынствам Ніны Мазай у ходзе асамблеі адбылося пасяджэнне геапалітычнай групы «Еўразія». Былі выпрацаваныя ўзгодненыя пазіцыі па пытаннях аб бюджэце МПС на 2010 год і аб рэформе арганізацыі. Ніна Мазай таксама паведаміла журналістам, што ў справаздачы генеральнага сакратара МПС былі станоўча адзначаны дзеянні парламента Беларусі па стварэнні заканадаўчай базы па барацьбе з карупцыяй, «адмываннем» грошай, незаконнай вытворчасцю і гандлем зброяй і выбуховымі рэчывамі.

Дэлегацыя Нацыянальнага збору Рэспублікі Беларусь правяла шэраг двухбаковых сустрэч. У прыватнасці, адбыліся сустрэчы Ніны Мазай з кіраўнікамі парламенцкіх дэлегацый Венгрыі, Індыі, Карэі, Латвіі, Сербіі, прадстаўнікамі дэлегацый Вялікабрытаніі, Даніі, Кітая, Тайланда, Фінляндыі, Японіі, а таксама дэлегацый дзяржаў — удзельніц геапалітычнай групы «Еўразія».

**Леанід ТУГАРЫН.**

## «Сілічы» адкрываюць лядовы сезон

**31 кастрычніка ў гарналыжным цэнтры «Сілічы» Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пачынае сваю працу каток. Адна з найлепшых лядовых пляцовак зноў стане даступнай для ўсіх аматараў здаровага ладу жыцця.**

У гэты ж дзень у гарналыжным цэнтры «Сілічы» адбудзецца лядовае шоу, прымеркаванае да адкрыцця. На лёд выйдуць юныя фігурысты — навучэнцы спартыўных школ, гледачоў чакаюць арыгінальныя конкурсы, да таго ж кожны наведвальнік катка зможа стаць удзельнікам імправізаванай дыскатэкі на лёдзе.

Як расказалі ў аддзеле маркетынгу гарналыжнага цэнтра «Сілічы», да адкрыцця катка падрыхтавана больш за 300 пар канькоў. Менавіта столькі наведвальнікаў адначасова разлічваюць убачыць арганізатары, якія ў новым сезоне абяцаюць парадаваць сваіх гасцей новай праграмай, спартыўнымі спаборніцтвамі і конкурсамі. Для маленькіх наведвальнікаў сёлета таксама падрыхтаваны сюрпрыз — да іх паслуг новы дзіцячы гарадок, а ў кавярні — адмысловае дзіцячае меню, якое ацэняць і бацькі, і дзеці.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Уздоўж найбольш загружаных транспартных магістраляў сталіцы плануецца высаджваць толькі ясень

**Пра гэта паведаміў намеснік генеральнага дырэктара ўнітарнага прадпрыемства «Мінскзелянбуд» Аляксандр ДАРАХОВІЧ.**

Цяпер спецыялісты вывучаюць, як тыя ці іншыя пароды рэагуюць на агрэсіўнае асяроддзе транспартных артэрый. Ужо ёсць вынікі. Як высветлілася, найбольш устойлівы ясень.

**Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, «Мінск—Навіны».**

# ПРА СВАЕ ГРОШЫ ЛЕПШ ЗАЎЖДЫ МАЎЧАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А можа выкарыстаць і больш хітрую схему — скажам, з падкідным кашальком.

Яна прыкладна такая. На шляху падкідваецца кашалёк, пажылы чалавек яго падбірае, але тут «раптам» з'яўляецца гаспадар нібыта «згубленага капіталу». Злодзей патрабуе вярнуць кашалёк, пералічвае грошы, заяўляе, што тут не хапае пэўнай сумы, і патрабуе яе «кампенсаваць» — маўляў, пенсіянер паспеў прысвоіць частку наяўнасці. Разгубленаму старому застаецца хіба што задаволіць гэта патрабаванне — каб не мець «праблем з законам»...

— Увогуле, вельмі пажадана, каб пенсіянер прыходзіў па свае грошы не адзін, а, напрыклад, са сваякамі ці сябрамі, — адзначае Сяргей Вараб'ёў. — Калі ж такой магчымасці няма, то неабходна як мага больш незаўважна пералічыць пенсію і не ўступаць ні з кім у кантакты на вуліцы. Прычым атрымліваць выплаты ў банках ці ў аддзяленнях сувязі зусім не абавязкова. Па жаданні пенсію могуць прыносіць непасрэдна дадому, і ў першую чаргу пра гэта варта памятаць пажылым людзям, якія жывуць адны.

### НЕ ЗАБЫВАЦЦА НА... КАСТРУЛІ

Газ — гэта зручна. Але ў той жа час і небяспечна. Статыстыка сведчыць, што за першую палову гэтага года з «блакітным палівам» у краіне адбылося 13 няшчасных здарэнняў. У выніку пажараў, выбухаў і атручвання прадуктамі гарэння пацярпелі 19 чалавек.

Адна з прычын інцыдэнтаў — няспраўнасць газавага абсталявання ці яго самавольны перанос. Апошняе, дарэчы, катэгарычна забараняецца — на тое ёсць спецыялісты. Зрэшты, у надзвычайных здарэнняў ёсць і іншыя тлумачэнні — грэбаванне элементарнымі правіламі бяспекі.

— Ніколі нельга губляць пільнасці, — заўважае начальнік Крупскага ўчастка прыроднага і звадкаванага газу Дзмітрый Моніч. — Так, аднaзначна забараняецца ўключаць тую ж пліту дзецям ва ўзросце да 12 гадоў ці асобам у стане алкагольнага ап'янення, нельга пакідаць адчыненымі краны і вентылі, прывязваць да газаправодаў вяроўкі, сушыць над гарэлкамі бялізну, трэба мець спраўную вентыляцыю. А яшчэ за газам трэба няспынна сачыць. І даволі тыповае ў гэтым плане парушэнне — каструлі без нагляду. Іх ставяць на пліту і забываюць. Тым часам вада закіпае, пераліваецца, полымя затухае — а газ ідзе. І тут для няшчасця можа быць дастаткова дробязі — цыгарэты, уключанага тэлевізара ці нават электразванка.

### ПАЖАР СТВАРАЮЦЬ НАВАТ МЫШЫ

Асаблівасцю гэтага года стаў рост колькасці пажараў з-за маланкі. Няма сумненняў, што стыхійнае бедства прадбачыць амаль немагчыма. А вось папярэдзіць яго — даволі рэальна. Жорсткага патрабавання ўсталёўваць на прыватных дамах маланкаабарону цяпер няма. Але звярнуць увагу на гэта ўсё ж трэба. Тым больш, што клопат сам па сабе няхітры: часам дастаткова замацаваць на знешняй антэне металічны дрот дыяметрам не менш за 6 міліметраў, спусціць дрот уніз і «пасадзіць» на штыр у зямлі. Прычым змайстраваць падобны «адвод» можна і непасрэдна з металічнага даху.

Дзеля справядлівасці, маланкі — праблема больш «летняя». Увосень і ўзімку больш пытанняў з печкамі. Невялікія трэшчыны на дымаходзе — верагоднасць таго, што на паддашак патрапяць іскры і праз 3—6 гадзін адбудзецца ўзгаранне. Да пажару можа прывесці несвоечасовая ачыстка ад сажы таго ж дымахода, распальванне з выкарыстаннем бензіну і іншых гаручых вадкасцяў, а таксама... надта доўгія дровы. Калі іх памер большы, чым глыбіня паліўнай адтуліны ў печцы, ёсць рызыка падзення на падлогу. З адпаведнымі наступствамі.

— Асобная гаворка аб электраправодцы, калі памяшканне ўвесь час ацяпляецца, то яна можа служыць па 30 і больш гадоў, — зазначае **намеснік начальніка Крупскага райаддзела па надзвычайных сітуацыях падпалкоўнік Міхаіл САЧАНКА.** — Але калі існуюць перапады тэмпературы, праводку неабходна ўвесь час аглядаць, а пры высвятленні трэшчын — тэрмінова рабіць замену. Прычым асабліва небяспечнымі з'яўляюцца працяглыя ад'езды з дома. Падчас іх праводку могуць пагрызці мышы і пацукі, а гэта — шлях да ўзгарання. Да слова, варта заўважыць, што некаторым пенсіянерам замена праводкі, рамонты печак, усталяванне аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў робіцца бясплатна. Але такая магчымасць прадугледжваецца толькі для цалкам адзінокіх старых — дапамагчы астатнім павінны дзеці.

Тым часам печкі і праводка яшчэ далёка не ўсё. Нашмат часцей пажары здараюцца з-за курэння ў нецвярозым стане — у сітуацыі, калі чалавек засынае. Таксама небяспечны фактар — і бытавая тэхніка. Каб пазбегнуць пажару, яе трэба выключаць з разеткі штораз, калі выходзіш з дому.

— Трэба звярнуць асаблівую ўвагу на тэлевізары, — падкрэслівае Міхаіл Сачанка. — Як вядома, яны могуць заставацца падключанымі да сеткі ў «рэжыме чакання», прычым калі-нікалі тэлевізар стаіць на «чырвонай кнопцы» суткамі. Але зірніце ў любую інструкцыю: там такі рэжым заўсёды абмяжоўваецца 2 гадзінамі. Перавышаць гэты ліміт сапраўды нельга. Бо ў тэлевізары гадамі назапашваецца пыл, а ён — вельмі пажаранебяспечны. І прыкладаў, калі злоўжыванне «рэжымам чакання» прыводзіла да бяды, — безліч.

**Сяргей ГРЫБ.**
*Мінск — Крупкі.*



## МАЛОЧНАЯ РАКА ПАЧЫНАЕЦЦА Ў КАЦІЛАВЕ

**Малаказборшчык Уладзімір ПЯТРОЎСКІ шэсць гадоў кожную раніцу аб'язджае вёскі Кацілава, Томкі, Клётаў Двор і яшчэ некалькі хутароў і вязе ў свой двор па 350 літраў добрай якасці малака. А летам дык наогул да паўтоны. Дагэтуль больш за 20 гадоў зборам малака займалася яго жонка Фаіна. «У гэтай справе няма выхадных, і спазняцца таксама нельга», — кажа малаказборшчык. — А яшчэ гэта цяжкая фізічная праца, бо паднімаць рукамі на малакавоз саракалітровыя бітоны не тое што жанчыне, не кожнаму мужыку па сілах».**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Запрашальнік

# ПАТАЎЧЫСЯ НА ДЗЯДЫ

**У Мінску збіраюцца рэканструяваць старадаўнія могілкі і даць свой адказ «буржуйскаму» святу Хэлоўіну.**

Міжнародны фольк-фестываль «Таўкачыкі», заснаваны яшчэ ў 2000 годзе лідарам гурта «UR`IA» Юрам Выдронкам, добра вядомым прыхільнікам і заўзятым актывістам захавання нацыянальнага фальклору. Кожны фэст, на якім традыцыйна збіраюцца носьбіты этнічнай музыкі — этнаграфічныя гурты і выканаўцы з розных рэгіёнаў Беларусі — гэта больш чым серыя канцэртаў, гэта таксама рэканструкцыя старажытных абрадаў, на пошукі якіх выпраўляюцца экспедыцыі, а яшчэ эксперыментальная пляцоўка для беларускіх музыкаў і гасцей з іншых краін. Папярэднія фестывалі былі прымеркаваныя да такіх святаў народнага календара, як Юр'я і Каляды. Цяперашні, пяты па ліку, «Таўкачыкі на Дзяды, або Хэлоўін па-беларуску», адбудзецца 3 лістапада на вялікай сцэне тэатра імя Я.Купалы і, як запэўніваюць арганізатары, рыхтуе шэраг сюрпрызаў.

Адным з іх стане тое, што частка сцэны будзе стылізаваная пад аўтэнтычныя могілкі — з крыжамі, драўлянымі надмагіллямі-надрубамі, якія нагадваюць саркафагі, і сапраўдным сталом са стравамі для душ нябожчыкаў-продкаў.

**— Людзі тэатра — народ прымхлівы; як успрынялі купалаўцы вашу ідэю з могілкамі і містычнай атмасферай? — цікавімся ў Юрыя Выдронка.**

— Як ні дзіўна, гэта ў іншых месцах нам адмаўлялі, а ў Купалаўскім мы сустрэлі поўную падтрымку і ўзаемаразуменне, пачынаючы ад новага кіраўніка тэатра да рабочых сцэны. Акрамя таго, гэта будзе не выключна самотная пастаноўка з жахамі, слязьмі і сумнымі песнямі, а канцэрт-спектакль з добрай музыкай, аўтэнтычнымі святочнымі спевамі і абрадам ушанавання памерлых продкаў.

**— А Хэлоўін тут пры чым, якое дачыненне ён мае да беларускага абраду?**

— Хэлоўін — тыя ж Дзяды, толькі з кельцкай традыцыі, якая потым распаўсюдзілася ў Еўропе і ЗША і вярнулася да нас ужо ў выглядзе чужароднага свята. Як і беларусы, кельты ў свой Samhain (31 кастрычніка) ушаноўвалі духаў продкаў, частавалі іх рознымі стравамі ды напоямі... Вось мы і вырашылі аб'яднаць два святы. На сцэне ў нас элементы Хэлоўіна таксама будуць прысутнічаць — у выглядзе як мінімум аднаго вялізнага ярка-аранжавага гарбуза, прывезенага з апошняй этнаграфічнай экспедыцыі.

Спяваць і музіцыраваць, дарэчы, у «Таўкачыках на Дзяды» збіраюцца не толькі беларусы (этна-рок-шоу «Юр'я», праект «Дзівасіл», дзіцячы калектыў з Мінска «Гарлачыкі», этнаграфічны гурт з Любанскага раёна «Глыбокія крыніцы», гурты «Нагуаль» і «Альтанка», пластычны тэатр «ІнЖэст»), але таксама госці — мультыінструменталіст з Польшчы Барталамей Лех Палыга і гурт «Zespol Polski», Масуд Талебані з Курдыстана. Удзельнікі фэсту ўласнымі сіламі, без прыцягнення прафесійных акцёраў, плануюць паставіць урывак з паэмы Адама Міцкевіча «Дзяды». І прапануюць усім ахвотным адзначыць «Хэлоўін па-беларуску» разам!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

### А ХАЛАДЗІЛЬНІК ПУСТЫ...

Да пенсіянера в. Юзафіны Пінскага раёна зайшоў беспрацоўны з в. Пучыны. Калі госць пакінуў хату, гаспадар убачыў, што халадзільнік пусты. Усё мяса, якое назапасіў пенсіянер (8 кг), мужчына прыхапіў з сабой.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Абзац

◢ **Суд Цэнтральнага раёна Мінска прыгаварыў дэпутата Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, намесніка старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Уладзіміра Карунаса да пяці гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Пра гэта паведаміў старшы памочнік пракурора Мінска Сяргей Балашоў.**

◢ Амаль 10 тыс. дзяцей адпачываюць у лагерах Мінскай вобласці падчас восеньскіх канікулаў. У перыяд з 26 па 31 кастрычніка працуюць больш за 200 лагераў з дзённым знаходжаннем. Тут арганізавана трохразовае харчаванне і разнастайныя забаўляльныя мерапрыемствы.

◢ **Сярэднюю працягласць жыцця людзей можна падоўжыць на 5 гадоў шляхам зняцця пяці асноўных рызык для здароўя, гаворыцца ў новым дакладзе Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Да гэтых пяці фактараў належаць зніжаная маса цела нованароджаных, неабаронены сэкс, ужыванне алкаголю, адсутнасць чыстай пітной вады і санітарыі, павышаны крывяны ціск. З імі звязаная чвэрць усіх выпадкаў смерці.**

◢ У Кабяляках Палтаўскай вобласці ўчора памёр на 73-м годзе жыцця народны ўрач СССР, заслужаны ўрач Украіны Мікалай Касьян. Яго называлі пачынальнікам мануальнай тэрапіі ў СССР. Апошнія гады ён хварэў і практычна не займаўся ўрачэбнай практыкай.

## Поўны абзац

◢ **Стойкі часночны водар стаіць у казармах вайскоўцаў тэрміновай службы Заходняга аператыўнага камандавання Сухапутных войскаў Украіны. У мэтах недапушчэння захваральнасці асабовага саставу на грып у штодзённы рацыён салдатаў уведзеныя свежы часнок і цыбуля. Камандзірам рэкамендавана не дапускаць фактаў пераахалоджвання вайскоўцаў, сачыць, каб яны апраналі зімовую форму адзення і абавязкова елі ў прафілактычных мэтах часнок і цыбулю.**

◢ Аднаногі бежанец з Расіі зайшоў у бельгійскую абутковую краму і скраў адзін чаравік. З-за спецыфікі крадзяжу злодзея знайшлі хутка. Аднаногі інвалід стаў асноўным падазроным пасля таго, як супрацоўнік абутковай крамы ў горадзе Мальдгеме выявіў прапажу толькі аднаго чаравіка. Чаравік вярнулі законным гаспадарам — да пары, а нешчасліваму злодзею прад'яўлена адпаведнае абвінавачванне.

◢ **Нарвежац спрабаваў перасячы мяжу з 10 яшчаркамі ў сподняй бялізне. Мытная служба краіны затрымала 22-гадовага маладога чалавека, які спрабаваў правезці ў краіну пад адзеннем 24 жывыя істоты рэдкага віду. Спачатку мытнікі знайшлі тарантула ў яго сумцы, затым быў праведзены вобыск на яго целе. Было канфіскавана 14 шкарпэтак, прыклееных да торса скотчам. У кожнай знаходзілася па адным каралеўскім пітоне. У плаўках знайшлі яшчэ 10 каробачак, у якіх было столькі ж бязногіх яшчарак-альбіносаў. А ўвагу на сябе нарвежац звярнуў тым, што «ўсё яго цела ходырам хадзіла», як сказалі спрактыкаваныя ў такіх справах памежнікі. Затрыманы будзе знаходзіцца пад вартай да той пары, пакуль не заплаціць штраф у памеры 2252 долары.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## АЗАРАНКА ПЕРАМАГЛА ЯНКАВІЧ І ПРАЙГРАЛА ВАЗНЯЦКІ



Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка з перамогі пачала выступленне на выніковым турніры Жаночай тэніснай асацыяцыі (WTA), які праходзіць у Досе (Катар). На спаборніцтвы запрошаныя восем наймацнейшых тэнісістак свету, прызавы фонд складае 4,55 мільёна долараў. Тэнісісткі падзеленыя на дзве групы, па дзве лепшыя спартсменкі выйдуць у паўфіналы, якія пройдуць 31 кастрычніка. Пераможца турніру атрымае 1,5 мільёна долараў, фіналістка — 780 тысяч, перамога ў кожным матчы ацэньваецца ў 100 тысяч долараў. Адкрыла элітны турнір якраз-такі беларуска (Азаранка 6-я ў сусветнай кваліфікацыі) матчам з сербкай Аленай Янкавіч. Вікторыя выйграла паядынак, які працягваўся паўтары гадзіны, — 6:2, 6:3. Трэба адзначыць, што 24-гадовая сербская тэнісістка ўжо ў трэці раз выступае на такім турніры, які з'яўляецца неафіцыйным чэмпіянатам свету. Азаранка ж прыехала на яго ўпершыню. Учора ўвечары беларуска сустракалася з датчанкай Каралін Вазняцкі. Азаранка выйграла першы сэт (6:1), прайграла другі (4:6), і саступіла ў трэцім (5:7), матч доўжыўся амаль 3 гадзіны.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі АДАШКЕВІЧУ Уладзіміру Сцяпанавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Калектыў газеты «Звязда» глыбока спачувае намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі АДАШКЕВІЧУ Уладзіміру Сцяпанавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

## ОТА ШМІТ — САМАЯ ПАПУЛЯРНАЯ ГІСТАРЫЧНАЯ АСОБА МАГІЛЁВА

**Дзясятку галоўных творцаў магілёўскай гісторыі ўзначаліў навуковец, акадэмік, даследчык Поўначы, кіраўнік арктычных экспедыцыяў, заснавальнік Вялікай савецкай энцыклапедыі, Герой Савецкага Саюза Ота ШМІТ.**



Ота ШМІТ.

У тройцы лідараў — пісьменнік **Канстанцін СІМАНАЎ** і мастак **Вітольд БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ.** Такія вынікі праекта, які ажыццявіла цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк абласнога цэнтра.

— Што такое дрэва без каранёў? — рытарычна пытаецца ***дырэктар бібліятэчнай сістэмы Галіна КРАЎЧАНКА.*** — Яно жыць не будзе! Кожнае пакаленне пакідае нашчадкам аўру — свае ідэі і думкі. І мы жывём у горадзе, які праславілі творцы яго гісторыі.

На працягу 8 месяцаў магілёўцы галасавалі за сваю дзясятку творцаў гісторыі. На сайтах і ў анкетах гараджане рабілі вольны выбар з двух дзясяткаў прапанаваных прозвішчаў друкароў, асветнікаў, грамадскіх і рэлігійных дзеячаў, пісьменнікаў, мастакоў, краязнаўцаў. Можна было выступіць і з уласнай прапановай. Такім чынам, напрыклад, у спісе з'явіліся прозвішчы старшыні Магілёўскага гарвыканкама Віктара Шорыкава і вядомага музыканта Леаніда Іванова.



Канстанцін СІМАНАЎ.

Увогуле прагаласавалі амаль 3800 чалавек. У выніку атрымалася ганаровая дзясятка. Першыя тры месцы ў ганаровай дзясятцы названыя вышэй, і толькі на 4 галасы адстаў ад Бялыніцкага-Бірулі магілёўскі мастак **Павел МАСЛЕННІКАЎ.** На пятым месцы — праваслаўны архіепіскап **Георгі КАНІСКІ.** Далей — друкар **Спірыдон СОБАЛЬ,** прэзідэнт Гавайскай рэспублікі **Міхаіл СУДЗІЛОЎСКІ,** летапісец **Трафім СУРТА,** губернатар Магілёўшчыны **Аляксандр ДАМБАВЕЦКІ.** Замыкае дзясятку пісьменнік **Аляксей ПЫСІН.**



Вітольд БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ.

Гэты спіс, калі шчыра, лічаць даволі суб'ектыўным: людзі галасавалі за прозвішчы, якія на слыху. Маўляў, праспект Шміта ведае кожны магілёвец, лёс і прах Канстанціна Сіманава шчыльна звязаны з Буйніцкім полем, а музей Бялыніцкага-Бірулі месціцца ў старажытным асабняку ў цэнтры Магілёва.

З іншага боку, было крыўдна, што па-за дзесяццю творцамі засталіся, напрыклад, этнограф і фальклярыст Еўдакім Раманаў, заснавальнік магілёўскай школы гравюры Максім Вашчанка, каталіцкі архібіскуп Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч. Гэта людзі, якія шмат зрабілі для Магілёва.

Але разам з тым, народная дзясятка ёсць паказчык папулярнасці гістарычных асобаў. І таму аўтарытэтная камісія, у склад якой увайшлі гісторыкі і краязнаўцы, пакінула дзясятку без зменаў, але аб'явіла яе адкрытай для абмеркавання.

На ўласна галасаванні праект не заканчваецца. Магілёўская бібліятэчная сістэма абяцае выдаць інфармацыйныя матэрыялы, зрабіць электронныя прэзентацыі, праводзіць асветніцкія мерапрыемствы. У наступным годзе ўбачыць свет дзіцячая энцыклапедыя па гісторыі Магілёва.

**Ілона ІВАНОВА.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### АМЕРЫКАНСКІ ЭСМІНЕЦ АБСТРАЛЯЎ УЗБЯРЭЖЖА ПОЛЬШЧЫ



**Амерыканскі эсмінец USS Ramage абстраляў узбярэжжа Польшчы, паведаміў мясцовы тэлеканал TVN24. Інцыдэнт адбыўся, калі карабель, які ўдзельнічаў у сумесных амерыканска-польскіх вучэннях, выходзіў з порта горада Гдыня на поўначы краіны.**

Прэс-сакратар польскай ваеннай жандармерыі Марцін Вяцэк распавёў журналістам, што з эсмінца было зроблена тры стрэлы. Паводле папярэдніх звестак, у выніку здарэння ніхто не пацярпеў. Пабудовы на беразе не атрымалі ніякіх пашкоджанняў.

Польская паліцыя праводзіць расследаванне інцыдэнту. Пры гэтым прадстаўнікі органаў правапарадку падкрэсліваюць, што хутчэй за ўсё USS Ramage абстраляў узбярэжжа выпадкова. Аднак карціна здарэння да канца не аднаўленая.

Эсмінец ужо выйшаў з порта і знаходзіцца недалёка ад берага Гдыні. Паліцыя дапытвае сведак і членаў экіпажа. Амерыканскі бок учора каментарыяў з нагоды абстрэлу польскага ўзбярэжжа не даваў.

### МЕРКЕЛЬ АБРАНАЯ КАНЦЛЕРАМ НА ДРУГІ ТЭРМІН



**Анхела Меркель 28 кастрычніка была паўторна абраная канцлерам Германіі. «За» прагаласавалі 323 дэпутаты, «супраць» — 285, паведамляе Spiegel.**

Для ўхвалення кандыдатуры Меркель дастаткова было простай большасці ў 312 галасоў. Тым не менш, як адзначае Spiegel, у выніку Меркель атрымала на 9 галасоў менш, чым магла б разлічваць, прымаючы ды ўвагі агульную колькасць фракцый ХДС/ХСС і СВДП у бундэстагу.

Новы, «чорна-жоўты», кааліцыйны ўрад з кансерватараў і лібералаў прыйшоў на змену ўраду так званай «вялікай кааліцыі» з кансерватараў і сацыял-дэмакратаў. СДПГ, прайграўшы на выбарах у бундэстаг 27 верасня, перайшла ў апазіцыю.

Новы ўрад абяцае ўжо з 2011 года знізіць падатковы цяжар на 24 мільярды еўра штогод, а таксама правесці кардынальную рэформу фінансавання сістэмы аховы здароўя. Планы федэральнага ўрада ўжо сустрэлі рэзкую крытыку ўрадаў земляў, у тым ліку з боку паплечнікаў Анхелы Меркель па партыі, якія апасаюцца, што скарачэнне падатковых паступленняў пацягне за сабой рэзкае павелічэнне дэфіцыту бюджэту.

### КІТАЙСКАЯ ПАЛІЦЫЯ ЗНАЙШЛА 2000 ДЗЯЦЕЙ, ВЫКРАДЗЕНЫХ ДЛЯ ПРОДАЖУ

**Кітайская паліцыя за паўгода знайшла больш за 2 тыс. дзяцей, выкрадзеных на продаж. Частка з іх ужо вярнулася ў сем'і, бацькоў астатніх шукаюць. З гэтай мэтай на адным з урадавых сайтаў размешчаныя фатаграфіі знойдзеных дзяцей.**

Штогод у КНР знікаюць сотні або, па некаторых ацэнках, тысячы дзяцей. Злачынныя групоўкі крадуць іх, каб затым прадаць бяздзетным парам. У патрыярхальным кітайскім грамадстве асабліва цэняцца хлопчыкі: яны каштуюць прыкладна па 6 тыс. долараў, у той час як дзяўчатак прадаюць усяго па 500 долараў.

### ЕВАНГЕЛІЧНУЮ ЦАРКВУ ГЕРМАНІІ ЎПЕРШЫНЮ ЎЗНАЧАЛІЛА ЖАНЧЫНА



**Кіраўніком евангелічнай царквы Германіі ўпершыню абраная жанчына — 51-гадовая біскуп Гановера Маргот Кесман. За яе кандыдатуру прагаласавалі 132 з 142 членаў Сінода евангелічных і рэфарматарскіх цэркваў. Падчас наступных шасці гадоў Кесман будзе прадстаўніком інтарэсаў 25 мільёнаў пратэстантаў Германіі.**

Прадстаўнікі кансерватыўных колаў ЕЦГ крытычна ставіліся да кандыдатуры Кесман, маці чатырох дзяцей, з-за яе разводу з мужам два гады таму.

## Прамоўтарская кампанія братоў Клічко абяцае прывезці ў Мінск сусветных зорак бокса

**Прамоўтарская кампанія братоў Віталя і Уладзіміра Клічко «K2 East Promotions» заключыла кантракт з беларускім грамадскім аб'яднаннем прафесійнага бокса на правядзенне ў Мінску матчу.**

Галоўнай яго падзеяй стане паядынак беларускага цяжкавагавіка Аляксандра Усцінава, дзеючага чэмпіёна Еўропы па боксе сярод прафесіяналаў, які ўваходзіць у дзясятку сусветнага рэйтынгу. Шоу, якое, як мяркуецца, будзе трансляваццa на многія краіны свету (у прыватнасці тэлекампаніяй «Еўраспорт» на 53 краіны), пройдзе на 17-тысячніку «Мінск-арэна» ў сакавіку 2010 года. Арганізатары абяцаюць высакаякасны тэлевізійны і глядацкі прадукт, а ў якасці спецыяльных гасцей плануецца запрасіць у Мінск губернатара штата Каліфорнія Арнольда Шварцэнегера і былога мэра Нью-Ёрка Рудольфа Джуліані.

Наконт суперніка Аляксандра Усцінава пакуль няма дакладнасці, але гэта будзе баксёр з сусветным імем. У прыватнасці, перагаворы вядуцца з Алегам Маскаевым і Эвандэрам Холіфілдам. Гэта будзе бой за захаванне тытула чэмпіёна Еўропы, а магчыма, і чэмпіёна свету.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Дзеля памяці

# ЖЫЛІ З АДКРЫТАЮ ДУШОЮ

*Я не чакаў*
*І не гадаў,*
*Бо жыў з адкрытаю душою,*
*Што стрэне лютая бяда,*
*Падружыць з допытам,*
*З турмою*

Гэтыя радкі з верша «Прысяга» паэт Міхась Чарот надрапаў на сцяне камеры перад расстрэлам. Адчуваў, што на волю не выйдзе. Як і іншыя беларускія літаратары, дзеячы культуры і навукі, якія ў 1937 годзе апынуліся за кратамі — усяго больш за 100 чалавек былі расстраляныя ў ноч з 29 на 30 кастрычніка ў Мінскай турме НКУС.

Гэта быў самы моцны ўдар па беларускай інтэлігенцыі і па літаратуры ў прыватнасці. З ёю ў інтэрнацыянальнай краіне былі асобныя рахункі: яшчэ ў жніўні ва ўнутраным двары турмы шугала полымя, распаленае з рукапісаў «ненадзейных» пісьменнікаў. Сярод іх апынуліся Уладзіслаў Галубок, Цішка Гартны, Платон Галавач, Міхась Зарэцкі, Алесь Дудар, Валерый Маракоў, Анатоль Вольны і іншыя творцы... Выхад іх твораў да людзей ужо стрымала цэнзура, але дзеля надзейнасці гэтыя творы вырашылі вынішчыць назаўсёды — на вогнішчы, каб ад думак застаўся толькі попел. Але немагчыма было пазбавіць здольнасці думаць іх аўтараў, якія былі арыштаваныя, сядзелі за кратамі, прайшлі праз жудасныя допыты і катаванні. Іх можна было зламаць фізічна і прымусіць падпісаць усё, што трэба, але нават такія яны ўяўлялі пагрозу — бо ёсць талент, які пасутнасці сваёй свабодны. Гэта быў час, калі вырашэннем усіх праблем станавілася смерць. 22 беларускія пісьменнікі былі пазбаўленыя права на жыццё. Не дачакаліся блізкія і іншых вязняў «амерыканкі»...

Жахлівыя падзеі той ночы пацверджаны дакументальна, іх і тое, што было перад імі, апісаў у сваёй кнізе «Толькі адна ноч» Леанід Маракоў.

Але я пра іх даведалася раней, калі аднойчы хатняя гаспадыня, у якой давялося здымаць кватэру, расчулена падзялілася са мной сваім болем. Яўгенія Васільеўна Малашэвіч дайграла сумную п'есу на фартэпіяна — яе навучыла гэтаму маці — і распавяла, дзеля чаго: каб яна змагла калі-небудзь зарабляць, даючы ўрокі. Яна не змагла паступіць ва ўніверсітэт, бо была дачкой расстралянага «ненадзейнага» навукоўца. З дзяцінства яна памятала нястачы, якія давялося перажыць удаве рэпрэсаванага. Дачку рэпрэсаванага не ўзялі ў інстытут. Пазней давялося шукаць розныя варыянты, каб атрымаць абраную прафесію. Яе тата ўсяго толькі выкладаў беларускую філалогію... Яго расстралялі, а сям'я вельмі доўга яшчэ нічога не ведала пра тое, што насамрэч здарылася. Толькі здагадваліся — па стаўленні да сябе. І нават пасля таго, як яго рэабілітавалі, у блізкіх не было адчування «сцвярджэння праўды». Бо няма праўды тады, калі немагчыма вярнуць чалавека. Рэабілітацыя — толькі крок пакаяння, але няма ў ёй абсалютнай праўды, бо немагчыма адматаць гісторыю назад.

У беларускай гісторыі і раней было шмат драматычных падзей. Ва ўсе часы гінулі людзі з любоўю да радзімы, былі таленты, не заўсёды пры жыцці ацэненыя народам і кіраўнікамі. Нішчылася культурная адметнасць беларусаў — а потым ішло шмат часу на тое, каб навярстаць, дагнаць, стварыць. Але такога, каб за адзін раз кулі высеклі цвет нацыі...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# НА МЯЖЫ ФУРЫ ХОДЗЯЦЬ ЦІХА

**АДРАЗУ шэсць аўтафургонаў з металам затрыманы дзякуючы сумесным дзеяннем супрацоўнікаў структур розных праваахоўных органаў Гомельскай вобласці. Па папярэдніх ацэнках, вага затрыманага лому перавышае 100 тон, паведамляе прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама.**

Вадзіцелі аўтамабіляў, якія стаялі на трасе ў кірунку Расійскай Фе-



Фота прэс-службы УУС Гомельскага аблвыканкама.

дэрацыі, не чакалі з'яўлення супрацоўнікаў праваахоўных органаў настолькі, што нервы аднаго з іх не вытрымалі: ён кінуў сваё аўто і збег. Усе машыны — з розных рэгіёнаў Беларусі і Расійскай Федэрацыі, аб чым сведчаць нумарныя знакі.

Грузавікі збіраліся ў Веткаўскім раёне на працягу некалькіх сутак, бо па той бок мяжы, у Клінцоўскім раёне Бранскай вобласці, іх чакалі расійскія праваахоўнікі. Вадзіцелі машын чакалі, пакуль расіяне «знімуць» пост. На вымушанай стаянцы іх і прыхапілі беларускія міліцыянеры. Як паведамілі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці, пры аглядзе машын высветлілася, што ўсе яны загружаныя ломам не толькі бытавым, але і прамысловым. Толькі ў аднаго з кіроўцаў былі дакументы на груз. Але ж, у адпаведнасці з імі, у машыне знаходзілася шклавата.

Цяпер высвятляецца, адкуль з'явіўся такі буйны груз металу і хто павінен быў яго атрымаць. Прынамсі, метал, які цяпер накіраваны разгружацца на дзяржаўнае прадпрыемства па зборы лому, будзе дакладна ўзважаны і дасканала правераны. Праваахоўныя органы не выключаюць, што сярод так званай другаснай сыравіны ёсць крадзеныя запасныя часткі і будаўнічыя канструкцыі. У дачыненні да ўсіх затрыманых будуць складзены адміністрацыйныя пратаколы, рашэнні па якіх прыме суд.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Праз дзверы ў турму

## Асудзілі ліпавага брэсцкага прадпрымальніка

**ЗА сваё нядоўгае жыццё брастаўчанін, які нарадзіўся ў 1981 годзе, ужо паспеў спаўна зведаць турэмныя будні. Яго, яшчэ няпоўнагадовага, судзілі за наўмыснае забойства. Выйшаў на волю ў 2004 годзе і зноў пайшоў па нахільнай.**

— Пачынаючы з чэрвеня 2006 года і практычна на працягу двух гадоў малады чалавек пад выглядам дылера фірмаў-вытворцаў дзвярэй наведваўся на прадпрыемствы, у кватэры і тлуміў людзям галаву, — распавядае **старшы памочнік пракурора Брэсцкай вобласці Вольга ДЗМІТРУК.** — Паказваў узоры дзвярэй і заключаў з кліентамі ад імя двух брэсцкіх індывідуальных прадпрымальнікаў дагаворы. Забіраў грошы, але сам, зразумела, выконваць абавязкі па вырабе дзвярэй не меў магчымасці. Падчас расследавання ў махляра канфіскавалі штодзённік, згодна з пакінутым там запісам, доўг грамадзянам і юрыдычным асобам склаў 121 тысячу долараў.

Суд Маскоўскага раёна горада Брэста прыгаварыў махляра да 7 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі строгага рэжыму. Акрамя таго, прыгаворам суда на карысць 11 пацярпелых (хто на гэтым настойваў) спагнаны розныя сумы нанесенага ім урону, у тым ліку на карысць ЖБК-34 горада Івацэвічы больш за 108,5 мільёна рублёў. Пацярпелым таксама кампенсавана і маральная шкода ў памеры ад 200 да 500 тысяч рублёў.

**Надзея ДРЫЛА.**

# СКРАЎ ТРАКТАР, КАБ ПАЕХАЦЬ ПА ВЫПІЎКУ

**Малады чалавек скраў з вуліцы ў вёсцы Дубінка Магілёўскага раёна трактар, які належаў мясцовай фермерскай гаспадарцы. Праўда, ён не збіраўся пакінуць яго сабе, а толькі хацеў з'ездзіць у суседнюю вёску.**

Сутнасць у тым, што 20-гадовы жыхар Гомельскай вобласці жыў у знаёмых і падпрацоўваў у фермера, але калі аднойчы ўвечары выпіў, то яму не хапіла. Іншай магчымасці, акрамя трактара, дабрацца да новай дозы спіртнога не было. Ён не даехаў да крамы некалькі метраў: нецвярозы і без правоў, не справіўся з кіраваннем, уехаў у агароджу і не здолеў выехаць. Малады чалавек збег, але яго асобу дапамаглі вызначыць сведкі: яны пазналі чалавека за рулём трактара, які так настойліва прабіваўся ў краму па выпіўку.

**Алена КАЗЛОВА.**

# рЭвалюцыйныя змены?

НАПРЫКЛАД, дэкрэт Прэзідэнта аб членах Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу, які абнаўляецца да кожных парламенцкіх выбараў. Існуюць таксама два дэкрэты кіраўніка дзяржавы, якія датычаць дэкларавання даходаў і маёмасці кандыдатаў у прэзідэнты і іх блізкіх сваякоў. Ёсць яшчэ закон аб Цэнтральнай камісіі, прыняты да Выбарчага кодэксу, пра які многія не ведаюць. Яго таксама трэба ўмантаваць у выбарчыя нормы. Па-трэцяе, самы галоўны палітычны момант — рэкамендацыі АБСЕ. Пасля апошніх парламенцкіх выбараў мы давалі пэўныя гарантыі на высокім дзяржаўным узроўні, што будзем праводзіць работу над памылкамі па выніках таго заключэння, якое падрыхтуе АБСЕ. З улікам гэтых рэкамендацый (якія, дарэчы, шмат у чым перасякаюцца з прапановамі апазіцыйных палітычных партый) і былі падрыхтаваныя прапановы.

***— Ці ўсе пажаданні замежных экспертаў трапілі ў накіды законапраекта?***

— Усё ўлічыць немагчыма, — канстатуе старшыня Цэнтрвыбаркама. — Тым больш, часта мы проста не гатовыя рэалізаваць некаторыя прапановы. Напрыклад, АБСЕ рэкамендуе не складаць спісы выбаршчыкаў, а рабіць адзіны рэестр выбаршчыкаў, што цалкам выключыць магчымасць двайнога галасавання. Цудоўнае пажаданне! Аднак пакуль немагчымае для рэалізацыі... Стварыць рэестр выбаршчыкаў можна толькі пасля таго, як у нас з'явіцца рэестр насельніцтва. Пакуль ён не створаны, хоць ужо і ў працэсе — прыняты закон аб рэестры, і гэта цяпер пытанне часу. Я не выключаю магчымасці галасавання па рэестры выбаршчыкаў надалей... Некаторыя ж прапановы мы лічым немэтазгоднымі або ўзаемавыключальнымі... Нашай мэтай па выпрацоўцы прапаноў было ўсё ж такі не задавальненне патрабавання АБСЕ, хоць і гэта таксама ўлічвалася, а перш за ўсё — стварэнне найбольш зручнага, найбольш дэмакратычнага і найбольш блізкага нашым прымяняльнікам выбарчага заканадаўства. Вось дзеля чаго ўсе змены і рэформы. Хоць мы добра разумеем, што не ўсе нашы прапановы будуць сустрэтыя крыкам «Ухвалямс!» з боку тых, для каго мы стараемся. Ну, не можа закон задаволіць усіх! Тым не менш, зрухі прапануюцца істотныя. Пакуль цяжка казаць, што з іх увойдзе ў заканадаўства, але я спадзяюся, што ўсё, бо нашы прапановы разумныя. Яны перш за ўсё зыходзяць з меркаванняў здаровага сэнсу, а гэта самае галоўнае патрабаванне да закона, усё астатняе — другаснае. Выпрацаваныя прапановы, спадзяюся, палепшаць наш выбарчы працэс і, натуральна, далейшую ацэнку міжнародных назіральнікаў.

## «Пернікі» для галоўных «бізуноў»?

***— І ад міжнародных экспертаў, і ад апазіцыі кожныя выбары можна пачуць нараканні на датэрміновае галасаванне і магчымасці назірання за падлікам галасоў. Гэта ці не самы галоўны «бізун» апанентаў. Дык ці пойдуць ініцыятары паправак на тое, каб раз і назаўжды дазволіць назіранне і адмяніць «галасаванне загадзя», пры якім, што ўжо таіць, злоўжываюць адміністрацыйным рэсурсам...***

— Так, калі ўчастак у інтэрнаце ці інстытуце, — паспрабуй прайдзі міма яго, не дойдзеш да заліку. Аднак дзе ж ты знойдзеш таго студэнта потым, у нядзелю — асноўны дзень выбараў?.. Датэрміновае галасаванне — усё ж залішне дэманізаваны галоўны «бізун». Гэта вельмі зручная норма, якая існуе паўсюдна ў Еўропе, прычым там працэдура здзяйсняецца па пошце. І ніхто нікому не тлумачыць, чаму ён хоча прагаласаваць датэрмінова, а не прыйсці на выбарчы ўчастак. Дык чаму мы павінны адмаўляцца ад таго, што адпавядае здароваму сэнсу і зручна для выбаршчыкаў? У нас усё больш людзей праводзяць уік-энд не дома, прычым не толькі летам — зімой, скажам, катаюцца на лыжах. І гэта ў еўрапейскіх традыцыях. Я вось нядаўна сабралася на выхадныя ў Кіеў — білетаў не купіць ні туды, ні назад! Цягнік запоўнены, і ўсё гэта беларусы, якія на выхадныя едуць пагуляць па Кіеве. Я думаю, што гэта быў не адзіны, выключны дзень і не адзіны такі кірунак. На мяжы з Літвой — заўжды чэргі: беларусы часта праводзяць выхадныя ў Вільнюсе. Так што еўрапейскія каштоўнасці становяцца нам усё бліжэйшымі. Тое, што выбаршчык не хоча ці не можа прыйсці галасаваць у нядзелю — гэта абсалютна апраўдана, ён вольны чалавек, і дзяржава павінна клапаціцца пра тое, каб яму было зручна ўдзельнічаць у выбарах, а не наадварот: каб выбаршчык павінен быў кідаць усе свае справы, адмяняць планы — і бегчы на выбарчы ўчастак. Датэрміновае галасаванне — гэта зручная, добрая і агульнапрынятая міжнародная норма. У ЗША, напрыклад, датэрмінова галасаваць можна за 3 — 40 дзён да выбараў. А ў адным са штатаў наогул прагаласаваць можна толькі датэрмінова і толькі па пошце. Таму ад датэрміновага галасавання мы не адмаўляемся. Аднак прапануем змены, якія павялічаць давер да гэтай працэдуры і яе празрыстасць. У прыватнасці, замацуем заканадаўча практыку, якую мы прымянялі падчас апошніх парламенцкіх выбараў з ухвалення і па просьбе АБСЕ: дадатковая засцярога скрыняў для галасавання — іх штодзённае апячатванне, адкрыццё выбарчых участкаў у першы дзень правамоцным складам камісіі. Больш за тое, мы дапаўняем гэты працэс складаннем штодзённага пратакола аб колькасці атрыманых бюлетэняў, тых, што былі выдадзеныя выбаршчыкам, і тых, што былі сапсаваныя. Гэта будзе ўсеагульная інфармацыя, з якой зможа азнаёміцца любы назіральнік.

***— Што ж зменіцца ў назіранні за выбарамі?***

— Магчымасці назірання дзякуючы нашым прапановам будуць пашыраныя, — запэўнівае кіраўнік Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. — У тым ліку і за кошт прыцягнення большай колькасці назіральнікаў. Паводле нашых прапаноў, назіраць за выбарамі змогуць самі кандыдаты (у дэпутаты, або ў прэзідэнты): мы даём ім магчымасць сядзець на выбарчым участку і назіраць за ходам выбараў. Мы прапануем таксама павялічыць колькасць назіральнікаў не толькі за кошт членаў грамадскіх арганізацый і палітычных партый, але і за кошт іх прадстаўнікоў. Для партый гэта вельмі вялікі плюс: членства ў іх вельмі абмежаванае, а асобаў, якія пагодзяцца папрацаваць на партыю, я думаю, набраць не праблема.

Згодна з прапановамі ЦВК, у заканадаўстве будзе дакладна прапісвацца, што падчас падліку бюлетэняў назіральнік павінен (!) знаходзіцца ва ўмовах, якія дазваляюць бачыць працэдуру падліку.

— Гэта тая гарантыя правоў назіральнікаў, якая, дарэчы, прапісана ў Канвенцыі аб стандартах свабодных і справядлівых выбараў краін СНД, — тлумачыць Лідзія Ярмошына. — Аб нашым намеры далучыцца да яе мы заяўлялі яшчэ напярэдадні мінулых парламенцкіх выбараў.

## Максімум — 185,5 млн рублёў для прэзідэнцкай кампаніі

Адно з самых прагрэсіўных новаўвядзенняў новага варыянту Выбарчага кодэксу — гэта магчымасць кандыдатам у дэпутаты і ў прэзідэнты ствараць асабістыя фонды і выдаткоўваць на сваю перадвыбарную кампанію нешта звыш заўжды сціплай бюджэтнай сумы. У тэорыі гэта дасць зялёнае святло ў парламент бізнэсменам, на якіх, па сутнасці, і трымаецца эканоміка і якія нарэшце змогуць там адстойваць свае інтарэсы...

— Даўно паступаюць скаргі (асабліва падчас кампаніі па выбарах прэзідэнта) на тое — і гэта, дарэчы меркаванне і АБСЕ таксама, — што сродкаў, якія вылучае дзяржава, недастаткова для правядзення паўнавартаснай агітацыйнай кампаніі. І гэта сапраўды так. Скажу вам шчыра, я даўно выношваю ідэю аб падобных фондах. Я разумею, што гэта галаўны боль і мы вельмі моцна ўскладнім сабе жыццё. Зразумела, магчымыя фінансавыя злоўжыванні. Тым не менш, існаваць ва ўмовах сацыялізму, калі ў нас яго ўжо няма, мы не можам. Жыццё змяняецца — грамадзяне ўжо няроўныя матэрыяльна, ёсць дастаткова вялікая колькасць багатых людзей, якія хочуць удзельнічаць у выбарах. У грамадзян сёння іншыя патрэбы, іншыя патрабаванні да інфармацыйнага забеспячэння выбараў, значыць, дзяржава павінна падцягваць пад гэтыя патрэбы і чаканні выбарчае заканадаўства.

Паводле прапаноў Цэнтрвыбаркама фонд кандыдата можа фарміравацца з яго асабістых сродкаў, сродкаў спонсараў — грамадзян Беларусі (выбаршчыкаў), камерцыйных структур Беларусі. Калі ў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў ёсць небюджэтныя сродкі, яны таксама могуць дапамагаць імі сваім кандыдатам. Пад забаронай — грашовыя паступленні ад міжнародных арганізацый, замежных прадпрыемстваў, замежных грамадзян, асобаў без грамадзянства, арганізацый, якія поўнасцю ці часткова фінансуюцца з бюджэту, а таксама рэлігійных арганізацый.

— Каб фонды не былі непамерныя і адзін кандыдат не «задушыў» усіх астатніх сваёй кампаніяй, мы прапануем абмежаваць фонд памерам не больш чым тры тысячы базавых велічынь, — падкрэслівае спадарыня Ярмошына. — На сёння гэта 105 млн беларускіх рублёў. Гэта не так ужо і шмат, але ж і не так мала. Калі ўлічыць, што кожнаму кандыдату ў прэзідэнты законам прадугледжаныя выдаткі з бюджэту ў памеры 2,3 тысячы базавых велічынь (80,5 млн). Калі б выбары праходзілі зараз, і змены прайшлі б у заканадаўстве, то максімальная сума, якой валодаў бы кандыдат у прэзідэнты, складала б 185,5 млн рублёў. Ліміт фонду кандыдата ў дэпутаты — 1000 базавых велічынь, пры гэтым дзяржавай яму выдзяляецца яшчэ 50 базавых велічынь.

Расходаванне сродкаў не толькі абмежаванае, але яшчэ і мэтавае:

— Фонд ствараецца спецыяльна для забеспячэння агітацыйных паслуг: каб надрукаваць лістоўкі, набыць час на рэкламу і выступленні па радыё і тэлебачанні, газетныя плошчы для ўласнай рэкламы, перадвыбарных выступленняў, аплаціць кансультацыйныя і агітацыйныя паслугі — работу тых асобаў, якія будуць працаваць на «раскрутку» кандыдата, у тым ліку і збіраць подпісы. Адзінае, што подпісы трэба збіраць да таго, як цябе зарэгіструюць кандыдатам, а магчымасць аплаціць паслугі зборшчыкаў з'явіцца толькі пасля рэгістрацыі (фонд можа быць утвораны толькі пасля рэгістрацыі кандыдата на выбарную пасаду). Я думаю, не трэба залішне пашыраць магчымасці расходавання сродкаў, бо ніхто не адмяняў патрабавання, паводле якога подкуп выбаршчыка недапушчальны і з'яўляецца безумоўнай падставай для адмены рэгістрацыі як кандыдата ў прэзідэнты, так і кандыдата ў дэпутаты.

## Стане відаць і чуваць?

У ЦВК разлічваюць, што, дзякуючы новаўвядзенням, агітацыя ажывіцца:

— Кандыдаты будуць прысутнічаць на інфармацыйным полі. На што падчас выбараў, асабліва парламенцкіх, часта скардзяцца? Ды не ведаем мы тых кандыдатаў, не ведаем за каго галасаваць — іх не відаць і не чуваць. А прычына ў тым, што формы агітацыі, якія сёння прадугледжаныя беларускім заканадаўствам у якасці бясплатных, не прымяняюцца. Ну, не ходзяць нашы кандыдаты па кватэрах, не стаяць яны ля пад'ездаў з бабулямі, няма ў іх такой работы з выбаршчыкамі. З іншага боку, паспрабуй выбаршчыка выцягні на тую перадвыбарную сустрэчу. Хіба што калі бясплатны канцэрт будзе, можа, тады і з кандыдатам заадно сустрэнуцца... Трэба глядзець праўдзе ў вочы. Калі ж з'явяцца сродкі, гэта зробіць выбарчую кампанію больш эфектнай.

Такую форму перадвыбарнай агітацыі, як дэбаты, Лідзія Ярмошына лічыць дастаткова эфектыўнай, праўда, з агаворкамі:

— Пару скандальных заяў, нешта непрыстойнае — і цябе паслухаюць. Магчыма, адзін раз — наўрад ці ты пратрымаешся даўжэй на гэтым капітале, аднак метад «забойны». Скандал, эпатаж, абвінавачванне... Уся праблема ў тым, што дэбаты, як правіла, працуюць на аўтсайдараў — тых, хто нікога да выбараў не прадстаўляе, ні за што не адказвае, на ім не ляжыць адказнасць за лёс краіны, горада, акругі, раёна... Ён крытык — ні больш, ні менш. А пазіцыя крытыка заўжды зручная і выйгрышная ў дачыненні да пазіцыі таго, хто сапраўды штосьці ці кагосьці прадстаўляе. Калі кандыдат палічыць, што дэбаты — ні больш, ні менш як прадуманая акцыя па яго маральным знішчэнні, я думаю, не трэба абавязваць яго да ўдзелу ў дэбатах... Таму мы не прапануем дэбаты як абавязковую ўмову ўдзелу ў выбарах, аднак замацоўваем такую магчымасць — калі кандыдаты пажадаюць — калі ласка. Калі ж яны гэтага не захочуць, прымушаць іх заканадаўча мы не будзем.

Аднак колькасць кандыдатаў, на думку Лідзіі Ярмошынай, ад прагрэсіўных захадаў па стварэнні фондаў, якія плануецца зрабіць, не залежыць:

— Для гэтага патрэбныя людзі, здольныя вылучыцца, павесці за сабою. І такіх кандыдатаў не робяць грошы. Іх робіць абсалютна іншае: грамадскае прызнанне, уласная харызма, падтрымка аднадумцаў, іншыя якасці, нашмат вышэйшыя і большыя, чым грошы. Так, ты аплаціш работу чалавека, які збірае подпісы, аднак яму гэты подпіс за цябе ніхто не паставіць...

## Проста, як граблі

Парадак вылучэння кандыдата шляхам збору подпісаў, з якім раней была безліч праблем, цяпер спрашчаецца неверагодна:

— Мы адыходзім ад неабходнасці засведчвання подпісаў у выканкамах, дастаткова будзе подпісу члена ініцыятыўнай групы, які і збіраў гэтыя подпісы, — кажа старшыня Цэнтральнай камісіі. — Вялікая колькасць подпісаў прызнавалася несапраўднай у сувязі з тым, што яны не былі засведчаныя належным чынам. Былі і іншыя нюансы афармлення: у адным падпісным лісце не маглі значыцца подпісы жыхароў розных раёнаў. І на практыцы атрымлівалася, што неабходная колькасць подпісаў была сабраная, аднак з-за гэтых недарэчнасцяў лісты бракаваліся, і кандыдат выбываў з гонкі. Цяпер мы змяншаем колькасць абмежаванняў. А калі меншай колькасці кандыдатаў будзе адмоўлена ў рэгістрацыі, натуральна, гэтыя змяненні ў закон будуць працаваць на альтэрнатыву ў выбарах.

Спрашчаецца і вылучэнне ад палітычных партый: неабавязкова, каб у акрузе, па якой балатуецца кандыдат у дэпутаты, была арганізацыйная структура партыі.

## У роўных прапорцыях?

Улічана таксама патрабаванне АБСЕ аб квотах пры фарміраванні выбарчых камісій:

— Мы прапануем гарантаваную квоту ўдзелу для палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў (не менш за адну трацінý), абмяжоўваем прысутнасць у выбарчых камісіях дзяржаўных служачых (таксама да адной трацiны), яшчэ трацiна — прадстаўнікі працоўных калектываў, звычайныя выбаршчыкі. Прадугледжваецца і скасаванне права выканкамаў і мясцовых саветаў дэпутатаў уключаць сваіх прадстаўнікоў у камісіі.

Наогул спрашчаецца парадак вылучэння ў склад выбарчых камісій: цяпер для вылучэння прадстаўніка ў выбарчую камісію любога ўзроўню дастаткова 10 подпісаў выбаршчыкаў (раней была дыферэнцыяцыя: для вылучэння ў тэрытарыяльную выбарчую камісію неабходна было сабраць 30 подпісаў, а ў акруговую па выбарах у парламент — 100).

Агаворваецца таксама, што старшынёй камісіі не можа быць асоба, якая звязаная сваяцкімі адносінамі ці знаходзіцца ў прамым падначаленні ў кандыдата на выбарную пасаду.

## Абскардзіць праз суд

— АБСЕ прапануе, каб усе выбарчыя працэсы маглі быць абскарджаныя ў судзе. У нас жа колькасць магчымасцяў для судовага абскарджання абмежаваная. І мы лічым гэту пазіцыю ў асноўным правільнай. Таму што пакідаць вынікі выбараў для судовага абскарджання — гэта захоўваць у падвешаным стане парламент ці наогул краіну, калі размова ідзе пра выбары прэзідэнта, бо судовыя спрэчкі могуць разглядацца да бясконцасці. Аранжавая рэвалюцыя ў Кіеве — прамы прыклад: пакуль цягнуцца судовыя спрэчкі, у краіне безуладдзе. І, натуральна, спрэчкі вырашаюцца пераважна «па паняццях», а не па законе... Таму мы лічым, што трэба, каб быў орган, які павінен ставіць кропку ў працэсе выбараў. Такім органам у нас з'яўляецца Цэнтральная камісія. І гэта апраўдана. Бо выбарчыя спрэчкі ўсё ж далёкія ад звычайнай работы судоў, гэта не зусім іх прызначэнне — вырашаць такія пытанні. Тым не менш, мы прапануем павялічыць колькасць выпадкаў, якія магчыма будзе аспрэчыць у судзе. Мяркую, прапанаванае будзе вітацца перш за ўсё прадстаўнікамі нашай апазіцыі. Мы прапануем увесці магчымасць для судовага абскарджання рашэнняў аб утварэнні выбарчых камісій. Раней скардзіцца можна было толькі у вышэйшую выбарчую камісію, і нас часта абвінавачвалі ў карпаратыўнай салідарнасці — маўляў, дзе ж тут акруговай камісіі адмяніць рашэнне ўчастковай.... Вось мы і хочам прапанаваць магчымасць звяртацца і ў суд. Гэта вельмі істотнае новаўвядзенне, таму што такіх скаргаў даволі шмат.

***Якой рэакцыі на беспрэцэдэнтныя змены чакаюць ініцыятары паправак?***

— Мяркую, рэакцыя будзе стрыманая, бо не ўсе прапановы ўлічаныя, — дзеліцца з намі развагамі старшыня ЦВК. — Тым не менш думаю, што шмат у чым будуць задаволеныя. Дарэчы, нават прадстаўнікі дэмакратычнай грамадскасці выказваюцца вельмі пазітыўна. Я вось чытала днямі заяву спадара Альфера: «Ярмошына пайшла далей за нашы прапановы». Для мяне гэта самы вялікі камплімент.

**Ала МАЧАЛАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# КЛІЧАЎСКАЯ ТРАДЫЦЫЯ — ПРАЦАВАЦЬ І СЯБЕ ПАВАЖАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зарабляюць пенсіянеры. І нават школьнікі бегаюць у лес на вакацыях і ў выхадныя дні, каб зарабіць сабе на новыя мабільнікі і моднае адзенне.

***— Чым жыхары Клічаўшчыны зарабляюць сабе на жыццё, акрамя збіральніцтва дароў лесу?***

— Асноўны заробак — сельская гаспадарка. За 9 месяцаў валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі амаль дасягнула 90 мільярдаў рублёў. Трацiну з гэтага дае прыватны сектар.

***— Маюцца на ўвазе прыватныя падворкі альбо фермеры?***

— У асноўным — падсобныя гаспадаркі. Фермеры займаюць вельмі малую долю ў нашай сельгасвытворчасці.

Таксама зарабляе Клічаўшчына на перапрацоўцы лесу. Прыватнае прадпрыемства «Элефант», дзе працуе болей за сотню людзей, вырабляе еўрападдоны, якія прадаюцца ў Прыбалтыцы.

У Клічаўскім лясгасе ёсць новыя лініі, і цяпер вядуцца перамовы з расіянамі пра пастаўкі клеенага брусу. Аднак толькі два месяцы таму прадпрыемства здолела выйсці на леташні ўзровень, таму што давялося на бягу перабудоўвацца і пераходзіць на новыя віды прадукцыі, якія цяпер карыстаюцца попытам.

***— Значыць, крызісныя павевы раён адчуў?***

— Вялікага ўдару не было. Новая ферма на 850 галоў дойнага статку ў саўгасе «Дабраволец» атрымала фінансаванне паводле ўказа Прэзідэнта. Лясгас паспеў зрабіць тэхнічнае пераўзбраенне за кошт крэдытаў. Зразумела, калі б не было крызісу, то можна было б завяршыць перапрацоўку драўніны да апошняга сучка. Але мы ўсё ж у перспектыве плануем усталяваць лінію брыкетавання драўнінных адходаў. З прадпрымальніцкіх праектаў: прыватнік будуе аграэкасядзібу.

***— Клічаўскі раён пакуль не ў лідарах якраз па развіцці гэтай галіны. Як вы лічыце, ці ёсць перспектыва прыцягнуць сюды турыстаў?***

— У нашага лясгаса ёсць цудоўная гасцініца, куды замежнікі прыязджаюць на паляванне. Хто не хоча забіваць жывёл, можа прыехаць з фотаапаратам, схадзіць у грыбы, палюбавацца краявідамі. У саўгасе «Дабраволец» наладжана рыбалоўства: набываеш білет, і маеш усе выгоды.

І, безумоўна, далей перспектыва ёсць, таму што ёсць цудоўная прырода. І пытанне не толькі ў грошах, але і ў энтузіястах. Японцы шукаюць спачатку кіраўніка, а потым ствараюць фірму. Для таго, каб было меней няўдач, трэба спачатку знайсці энтузіяста. А потым знойдуцца і грошы пад справу.

## Грыбнік з цвёрдасцю Чынгісхана

***— Цяпер у аграгарадках пануе амаль гарадскі лад жыцця. А ці ёсць вёскі ў Клічаўскім раёне, дзе захаваўся яшчэ стары сялянскі ўклад?***

— А вам хацелася б вярнуцца да сахі?

***— Не, вядома ж. Але, можа, варта захаваць з таго ўкладу традыцыі, святы, дачыненні, нарэшце — здаровае харчаванне. З цягам часу ўсё радзей бачыш, як нехта гатуе ў печы альбо робіць хатні кумпяк.***

— Прыязджайце бліжэй да Каляд! Знойдзецца і кумпяк, прыгатаваны паводле старажытнай тэхналогіі. Можна пачаставацца і капустай, зробленай у печы. Яшчэ не ўсё нашы людзі набываюць у крамах.

***— А вы — гарадскі жыхар?***

— Ужо дзесяць гадоў жыву ў райцэнтры. У мяне кватэра на чацвёртым паверсе. А калі працаваў у вёсцы, то была гаспадарка — карова, свінні, трусы. Трэба было гадаваць трох сыноў. Цяпер маю толькі 2,5 соткі агарода.

***— Вы сёлета былі ў водпуску? Можа, за мяжой?***

— Летась быў у санаторыі ў Бабруйску. Калі ёсць час, можна цудоўна адпачыць і ў нашай Беларусі. За мяжу добра паехаць павучыцца, паглядзець, абмяняцца вопытам. А для камфортнага адпачынку мне трэба размаўляць з людзьмі на адной мове.

***— Калі выдаецца вольны час, што вы робіце?***

— Вольнага часу мала. Сыны ў мяне пыталіся: «Бацька, а дзе ты быў, калі мы былі маленькія?» Так усё жыццё: сыходзіў на працу — яны яшчэ спяць, вяртаўся дадому — ужо спяць. Таму калі ёсць вольны час, то — да сям'і.

Яшчэ люблю ўвосень хадзіць у лес у грыбы. Сёлета гэта атрымалася нават двойчы. Нарэзаў апенек чатыры кашы. А яшчэ, калі ёсць магчымасць, люблю чытаць гістарычную літаратуру.

***— Ну чаму амаль усе кіраўнікі аддаюць перавагу менавіта гістарычнай літаратуры?***

— Таму што там можна знайсці адказы на пытанні аб узаемаадносінах з людзьмі. Я не лічу сябе вялікім кіраўніком, тым больш палкаводцам, але, паверце, у Чынгісхана ёсць чаму павучыцца.

***— Нават так?!***

— Сёння патрэбна воля кіраўніка і яго здольнасць мабілізаваць на дасягненне мэтаў. Часам даводзіцца дзейнічаць і цвёрдай рукой. Не, жорсткасць я не прымаю, але цвёрдасць павінна быць.

## Не рай, але пілавіннем жывёлу не кормяць

***— Кажуць, ад таго, што партызаны з клічаўскіх лясоў не пусцілі на сваю зямлю акупантаў і ў вайну працяглы час утрымлівалі тут сваю ўладу, мясцовыя людзі адрозніваюцца свабодалюбствам.***

— Я сказаў бы іначай: яны прызвычаіліся сябе паважаць. Гэта праўда. І яшчэ тут вельмі працалюбівыя людзі.

***— Калі шчыра, вы так кажаце не дзеля прыгожай фразы?***

— Заўважце, тут ніхто не сядзіць па лавах і не грэецца на сонейку — ні механізатары, ні жывёлаводы, ні пенсіянеры. Рукамі людзей быў адбудаваны пасля вайны раён, дзе спалілі ўшчэнт 30 вёсак! Народ шмат перажыў, аднавіў эканоміку. Старыя, якія перажылі вайну, вельмі цэняць тое, што сёння маюць.

***— А з чым звычайна цяпер прыходзяць людзі да вас на прыём?***

— Яны гавораць пра жыццё звычайнага чалавека. Дарогі, праблемы жыллёва-камунальнай гаспадаркі і працоўныя дачыненні, калі некага пакрыўдзілі ці несправядліва ацанілі.

> **«Сёння самае галоўнае — утрымацца на тым узроўні, якога мы дасягнулі. Не адкаціцца. Я добра памятаю 2000 год, калі мы вазілі салому з суседніх раёнаў, а жывёлу падсілкоўвалі пілавіннем. Сёння такіх праблем увогуле няма!**

***— Якія праблемы простых людзей вы лічыце сапраўды актуальнымі?***

— Дарогі, асабліва ў сувязі з сёлетнім дажджлівым надвор'ем. Паўсталі праблемы з пад'ездамі да малых вёсак, іх вуліцамі. Дарогі перададзеныя рашэннем райвыканкама дарожна-будаўнічай арганізацыі, але сродкаў на ўсё не хапае.

Апошнім часам узнікае другая праблема — працаўладкаванне. Не так проста знайсці людзям працоўныя месцы паводле іх кваліфікацыі. Асабліва гэта датычыцца моладзі, у якой яшчэ няма практыкі.

***— Што самае галоўнае вы хацелі б зрабіць на сваёй пасадзе?***

— Забяспечыць нармальныя, камфортныя ўмовы жыцця і працы для жыхароў Клічаўскага раёна. Рай мы не створым, але элементарнае, што можна зрабіць, хацелася б.

Для мяне 9 гадоў на пасадзе начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі не прайшлі дарма: мы прайшлі шлях ад 12 цэнтнераў з гектара да 43 летась. Я добра памятаю 2000 год, калі мы вазілі салому з суседніх раёнаў. А жывёлу на комплексе ў «Дабравольцы» нават падсілкоўвалі пілавіннем і торфам. Сёння такіх праблем няма! І ў нас шмат планаў.

## Год вяскоўца патрэбен Беларусі

***— У Беларусі летась быў Год здароўя, сёлета — Год зямлі. А якім, на вашу думку, мог бы быць наступны год?***

— Я зрабіў бы Год вяскоўца. Чалавека, які працуе на зямлі. Хацелася б, каб не толькі ў гарадах будаваліся вялікія лядовыя палацы, але і ў аграгарадках, дзе болей за тысячу жыхароў, працавала добрая спартыўная зала. Але і гэта не самае важнае. Галоўнае — гэта павага да працаўніка вёскі. Я лічу, што ён сёння абдзелены матэрыяльна. Яго праца павінна ацэньвацца вышэй за цяперашні ўзровень.

***— Так, у горадзе заробкі вышэй, але і ўмовы жыцця розныя. Як трапна сказала адна жанчына, казу на балконе не паставіш.***

— Ёсць і такія сяляне, якія сёння жывуць лепей за гараджан. Правільна, у яго ў агародзе ёсць агуркі і таматы, у пуні рохкае кабанчык, а кароўка дае малако. Але малако само не цячэ і бульба сама з зямлі не выскоквае! Чалавек адпрацаваў дзень на ферме ці на грамадскім полі, а потым прыходзіць дадому і яшчэ 4 гадзіны, а то і болей, працуе на сваёй гаспадарцы.

Праца вяскоўца сёння недастаткова аплачваецца. Мы прадаём літр малака за 600 рублёў, а ў краме яно каштуе ў тры разы даражэй. Пра гэта трэба задумацца.

***— Затое ўсе гараджане зайздросцяць сучасным і камфортным сельскім катэджам, якія вяскоўцы атрымліваюць бясплатна.***

— Так, але гэта не ўласны дом, а, прабачце, інтэрнат. Цудоўны і добраўпарадкаваны, але інтэрнат. Вясковы дом — гэта службовае жыллё, як і мая кватэра.

Напэўна, трэба ў гэтай сістэме нешта мяняць. Напрыклад, каб пасля 10 гадоў працы ў сельскай гаспадарцы можна было атрымаць дом ва ўласнасць. Чалавек можа ўзяць крэдыт і выкупіць гэта жыллё па рэштткавым кошце, але яно вельмі дарагое — ад 110 да 140 мільёнаў рублёў. Адкуль у вясковага жыхара такія грошы, асабліва ў маладога спецыяліста?

Безумоўна, камфорт — гэта выдатна. Чалавек, які адпрацаваў на ферме альбо ў полі на трактары, можа прыйсці і прыняць душ, прыгатаваць ежу на газавай пліце... Але ўсё ж адчуванне, што гэта «не маё», прыводзіць да таго, што гэтыя службовыя катэджы праз 25 гадоў становяцца спарахнелымі. Таму што гэта не радавое гняздо і не спадчына, якая застанецца дзецям.

## У Клічаве сытна і цёпла

***— Юлія Цімашэнка аднойчы параўнала крэсла прэм'ер-міністра з электрычным. А ў вашым крэсле якая «сіла току»?***

— Я з такім параўнаннем не згодны. Прычына не ў току, а ў ступені адказнасці: калі ты разумееш, што за табой стаіць 17 тысяч чалавек. Вядома ж, гэта невялікі раён, але гэта людзі, лёсы якіх і дабрабыт у нейкай меры залежаць ад цябе і каманды, якая з табой працуе.

Так, гэта не тая праца, калі сумленна адстаяў ля станка 8 гадзін, пайшоў і забыўся на працу, належыш сям'і і самому сабе. Таму груз адказнасці пастаянны, і высокая цана памылкі. Таму самае галоўнае — не дапускаць памылак.

***— Атрымліваецца?***

— Чалавек — не робат, не аўтамат і не можа быць застрахаваны ад памылак. Але ёсць веды і практыка. У мяне агульны стаж — 40 гадоў. І пасля арміі сёлетняе жніво было 34-м.

***— Як вы мяркуеце, што цяпер галоўнае для беларускага грамадства: перажыць крызіс, навесці парадак на зямлі, вырасціць багаты ўраджай...***

— Утрымацца на тым узроўні, якога мы дасягнулі. Не адкаціцца. Каб перажыць крызіс, трэба захаваць узровень вытворчасці. Для гэтага сёння ёсць база кіравання, узровень дысцыпліны і жыццяздольныя прадпрыемствы. Галоўнае, каб наша прадукцыя была запатрабаваная, каб яе нехта набыў.

***— Ці дае сабраны сёлета ўраджай клічаўскім людзям пачуццё абароненасці? Ці будзе ім цёпла і сытна?***

— Будзе. Калі казаць пра цяпло: нягледзячы на тое, што людзі цягнуцца да газу як да цывілізацыі, і актыўна вядзецца газіфікацыя прыватнага сектара, у грамадскім мы робім стаўку на самазабеспячэнне. Мы перавялі сваю кацельню на мясцовыя віды паліва і можам жыць без расійскага газу.

Тым больш будзе сытна: намалацілі 39 тысяч тон збожжа. Хоць, калі шчыра, гэта жніво было самым цяжкім для мяне, з-за ўмоў надвор'я. Убіралі хлеб з буксірам, падвойвалі колы на камбайнах, касілі ўручную. Але выцягнулі, з хлебам будзем.

**Гутарыла Ілона ІВАНОВА.**

*Клічаўскі раён.*

# ПАДЗЯЛІЎ...

Вечарам да жанчыны, якая пражывае ў Баранавічах у зав. Савецкім, падышоў былы муж. Пасля высвятлення адносінаў ён сарваў з жанчыны залаты ланцужок і частку яго забраў сабе. Міліцыя тое золата ў мужчыны канфіскавала і завяла крымінальную справу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

*Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь*
**ЗАРЕГИСТРИРОВАНО**
*26 октября 2009 года*
*__________ Гальперин А.Л.*

**УТВЕРЖДЕНО**
*Генеральный директор РУП «Витебскэнерго»*
*14 октября 2009 г.*
*__________ П.И. Харитонов*

**Изменения в проспект эмиссии облигаций Витебского республиканского унитарного предприятия электроэнергетики «Витебскэнерго» (второй выпуск)**

1. В пункте 2.9 раздела 2:
часть вторую изложить в следующей редакции:

«График выплаты купонного дохода по облигациям

| Номер купона (процентного дохода) | Начало периода | Дата окончания периода, дата выплаты дохода | Продолжительность периода, дней |
|---|---|---|---|
| 1 | 30.09.2009 | 01.01.2010 | 93 |
| 2 | 02.01.2010 | 01.04.2010 | 90 |
| 3 | 02.04.2010 | 01.07.2010 | 91 |
| 4 | 02.07.2010 | 30.09.2010 | 91 |
| Итого: | | | 365 |

часть четвертую изложить в следующей редакции:

«Купонный доход по облигациям за первый купонный период начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций, по дату выплаты купонного дохода за первый купонный период включительно. Купонный доход по облигациям за последующие купонные периоды начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период, по дату выплаты дохода по данному купонному периоду включительно (дату погашения).».

**Заместитель генерального директора по экономическим вопросам РУП «Витебскэнерго» С.В. Худоерко**

**Главный бухгалтер РУП «Витебскэнерго» С.М. Карабицкая**

УНП 300000252

**Изменение тарифов на услугу «Мобильный (SMS) банкинг» для абонентов СООО «МТС»**

СООО «Мобильные ТелеСистемы» обращает внимание абонентов: с 1 декабря 2009 года изменяются тарифы на услугу «Мобильный (SMS) банкинг». С 1 декабря 2009 года тариф исходящего SMS-сообщения на короткие SMS-номера в рамках оказания услуги «Мобильный (SMS) банкинг» для абонентов СООО «Мобильные ТелеСистемы» составит 190 рублей без учета НДС и налога на услуги.

Подробности — на сайте компании **www.mts.by** в разделе «Тарифы на информационно-развлекательные услуги», а также в Справочно-информационной службе МТС по телефону **(017) 237 98 98** и МТС **0890.**

Краіна здароўя
Выпуск № 44 (158)

**Паважаныя чытачы! Мы рады прапанаваць вашай увазе новы праект «Сакрэты даўгалецця». Калі ў вас ёсць свой рэцэпт, як захаваць моцнае здароўе і бадзёрасць духу ў пенсійным узросце, звяртайцеся ў рэдакцыю па тэлефоне... І ваша жыццёвая гісторыя стане прыкладам для ўсёй краіны.**

# МАРАФОН — У ПЯЦЬДЗЯСЯТ, ІНСТЫТУТ — У СЕМДЗЯСЯТ

## Пенсіянерка з Маладзечна праз паўгода атрымае трэцюю вышэйшую адукацыю



Калі Ларыса з'явілася на парозе адной з мінскіх цырульняў, майстар, акінуўшы вокам дзве таўшчэзныя касы, даўжэйшыя за лінію таліі, сурова запытала:

— Што будзем рабіць?

— Абразаць! — рашуча сказала дзяўчына і ўжо праз некалькі секунд пашкадавала аб сваіх словах, пачуўшы ў адказ гнеўнае «Прэч адсюль! Яшчэ што надумала!»

Не дапамагла пазбавіцца ад «кароны» і суседка па пакоі, якая, здаецца, лепш за іншых павінна была разумець, як цяжка ў студэнцкім інтэрнаце з гарачай вадой і як нязручна з такой прычоскай гуляць у валейбол і тэніс.

— У мяне рука не падымецца! — шчыра прызналася сяброўка. — Сама ж казала, што ў вас на ўсё Заслаўе толькі пяцёра дзяўчат з такімі косамі.

Давялося Ларысе дзейнічаць самой. Яна села перад люстэркам, распусціла валасы і, не зважаючы на матулін плач, што даносіўся з-за дзвярэй, зрабіла-такі сваю «чорную справу».

З той пары маладзечанка Ларыса Пятрэнка заўсёды носіць стрыжку: у народзе кажуць, што калі адрэжаш валасы сваёй рукой, яны больш ніколі не адрастуць. Але жанчына і цяпер успамінае свае састрыжаныя косы як самае ранняе праяўленне рашучасці і сілы волі. Следам за імі былі 40 кілаграмаў скінутай вагі, першы марафон, які яна прабегла ўжо пасля пяцідзесяці, і дыплом універсітэта фізічнай культуры аб трэцяй вышэйшай адукацыі, ад якога 70-гадовую маладзечанку аддзяляе ўсяго паўгода вучобы.

Паводле першага дыплома Ларыса Фёдараўна — настаўнік матэматыкі. Адразу пасля заканчэння педагагічнага ўніверсітэта нарадзіла сына, праз год — дачку. Хатнія клопаты, падрыхтоўка да ўрокаў і напісанне вучэбных планаў, вячэрнія курсы інстытута марксізму-ленінізму, на якіх яна атрымала свой другі дыплом, не пакідалі маёй субяседніцы ні гадзіны на сябе. Яна і не прыкмеціла, як стала важыць 96 кілаграмаў супраць ранейшых 50.

— Добра памятаю, як мы сядзелі з сынам на канапе і глядзелі перадачу «Калі хочаш быць здаровым». У ёй прыводзілі выказванне старажытных грэкаў: «Калі хочаш быць здаровым — бегай. Калі хочаш быць прыгожым — бегай. Калі хочаш быць разумным — бегай». Я яшчэ падумала: «Здаецца, я і прыгожая, і разумная, але чамусьці не бегаю». І вырашыла выправіць гэтую памылку.

Назаўтра 43-гадовая Ларыса выйшла на стадыён і пратрусіла 150 метраў — больш не змагла. Але трэба аддаць ёй належнае: наступныя тры месяцы не было ні дня, каб яна прапусціла прабежку. Загадзя з рэкамендацыяй вядучага праграмы, жанчына імкнулася кожны раз дадаць да сваёй дыстанцыі хоць некалькі метраў, і праз тры месяцы яна ўжо магла асіліць кіламетр, але скінула ўсяго толькі адзін кілаграм. Большасць з нас, пэўна, кінулі б гэты занятак, не бачачы вынікаў, але Ларыса праявіла настойлівасць і была ўзнагароджана: вага пачала змяншацца хутчэй, і за два з паловай года яна згубіла 25 кілаграмаў. Калі прыйшоў час мяняць пашпарт, інспектар, разглядаючы яе стары дакумент, насцярожылася: «Чый гэта здымак?»

Праз сем гадоў Ларыса Фёдараўна так нарасціла кіламетраж, што адважылася прабегчы марафон — 42 кіламетры 195 метраў.

— Гэтая дыстанцыя вызначана ў памяць аб старажытнагрэчаскім воіне, які падчас бітвы пры Марафоне прабег, не спыняючыся, 42 км ад Марафона да Афінаў, каб паведаміць пра перамогу. Ён толькі паспеў крыкнуць «Радуйцеся, афіняне, мы перамаглі!» — і ўпаў мёртвым. А 195 метраў — гэта рэveranс англійскай каралеве: дыстанцыю працягнулі, каб яе высакароддзе магла назіраць са свайго балкона за тымі, хто фінішуе.

Свой першы марафон Ларыса Фёдараўна прабегла ў латвійскім горадзе Елгава. На 35-м кіламетры ў яе «вырубіліся» ногі, і спрактыкаванаму бегуну, якога паставілі ёй у пару, даводзілася штурхаць наваяўленую марафонку кулаком у спіну. Перад вачыма ў жанчыны ўсё плыло, а метраў за 20 да фінішу яе прыхапіла сутарга. Адолеўшы фінішную стужку, яна гучна паклялася: «Гэта быў першы і апошні раз!»

Зараз Ларыса Фёдараўна, чатырохкратная чэмпіёнка рэспублікі па марафонскім бегу ў сваім узросце, з усмешкай згадвае свой «дэбют». З той пары яна прабегла 24 тысячы кіламетраў — гэта больш, чым да Уладзівастока і назад.

У спартыўнай скарбонцы маёй суразмоўніцы хапае міжнародных спаборніцтваў. Так, у 1994 годзе ў марафоне ў Франкфурце-на-Майне, дзе прынялі ўдзел 14 тысяч чалавек, яна стала сёмай у Еўропе ў сваёй узроставай катэгорыі. Але мая суразмоўніца ездзіць на чэмпіянаты не па ўзнагароды, а па здароўе:

— Наш арганізм назапашвае шлакі, быццам печка — попел. Калі яго не чысціць, распаліць ужо не зможаце — тое ж самае адбываецца і з чалавечым целам. Але пры працяглым бегу кожная клетачка ўстрэсваецца, і ўсё непатрэбнае выходзіць, як пыл з бруднага дывана. За чатыры з паловай гадзіны марафона я губляю 5 кілаграмаў вагі і яшчэ паўгода адчуваю сябе гадоў на 18.

18 гадоў — гэта, зразумела, перабольшванне. Але калі на занятках па фізіялогіі студэнты ўніверсітэта фізкультуры вызначалі свой біялагічны ўзрост, у Ларысы Фёдараўны атрымалася не больш не менш — 35. Менавіта добрае здароўе і душэўная маладосць дазваляюць маёй суразмоўніцы паспяваць так многа: і трэніравацца, і вучыцца, і зарабляць грошы.

Дарэчы, апошнія гады жанчына з дзвюма вышэйшымі адукацыямі працавала дворнікам.

— Выдатная, на мой погляд, праца: не трэба ніякіх планаў пісаць. А яшчэ, калі махаеш мяцёлкай і граблямі, вельмі добра думаецца.

Аднойчы, разграбаючы сцежкі, Ларыса Фёдараўна прыйшла да думкі, што ёй вельмі шкада свайго спартыўнага досведу: акрамя бегу, яна добра плавае і на ўзроўні першага разраду гуляе ў настольны тэніс і шахматы:

— Я нагадала сабе напоўнены келіх, з якога вось-вось пачне ліцца праз край, калі не адліць у іншую пасудзіну.

Але чалавеку без спецыяльнай адукацыі весці спартыўны гурток ніхто не дазволіць. Так пенсіянерка вырашыла стаць выкладчыкам-метадыстам аздараўленчай фізкультуры. Аб тым, што падала дакументы на завочнае аддзяленне, родным не сказала, толькі потым паставіла мужа і дзяцей перад фактам: «Я зноў студэнтка».

Параўноўваючы сваё першае студэнцтва з цяперашнім, Ларыса Фёдараўна адзначае:

— З узростам прыходзіць усведамленне таго, што табе патрэбныя веды. Я лекцый не прапускаю, на занятках гляджу ў рот выкладчыку. А распачаўшы з каторым з іх дыскусію, магу нават прапусціць перапынак.

Адзіная «шасцёрка» ў яе — па інфарматыцы.

— Не тое каб я не магла асвоіць камп'ютар. Проста ў мяне няма да яго цікавасці, бо я лічу, што лепшая машына — гэта наша галава. А каб трымаць яе ў рабочым стане, трэба клапаціцца аб усім целе.

Кожны дзень Ларыса Фёдараўна падымаецца ў пяць гадзін раніцы і, не зважаючы на надвор'е, накіроўваецца на трэніроўку ў гарадскі парк. Бяжыць звычайна адзін кіламетр, альбо тры, альбо пяць, бо цотныя лічбы лічыць нешчаслівымі. Пасля ўціраецца расой. Аднойчы схілілася да травы, а побач спыніўся мужчына: «Вы штосьці згубілі?»

Наступная частка штодзённага рытуалу — халодны душ:

— Падчас такой працэдуры тэмпература на паверхні цела рэзка падымаецца да 42°С, і ўсе шкодныя мікробы гінуць у адну хвіліну. Нядзіўна, што апошні раз я хварэла гадоў 20 таму.

Здаецца, Ларысе Фёдараўне ўжо няма аб чым марыць: выдатнае здароўе і, чаго так не хапае сёння нават маладым, вялікая цікавасць да жыцця. Але мара ўсё ж такі ёсць:

— Недалёка ад станцыі «Зялёнае» пад Мінскам ёсць закінуты піянерскі лагер. Калі б у мяне былі грошы, я зрабіла б на яго месцы... казку. Уявіце: дагледжаная тэрыторыя, кветкі, а па ёй гуляюць Канёк-Гарбунок, Папялушка... Сёння казка куды больш патрэбна дарослым. Іх свядомасць так забруджана штодзённымі клопатамі — «трэба купіць хлеба і малака», «трэба прыбраць у кватэры» — што за ўсім гэтым яны забываюцца радавацца жыццю. Мне здаецца, што калі чалавек трапіць у такое прыгожае месца, шоры ўпадуць з яго вачэй і ён зноў адчуе сябе дзіцем, зноў навучыцца заўважаць прыгожую кветку, пагодлівы дзянёк, пяшчотны позірк. І тады недзе ўсярэдзіне ў чалавека загарыцца маленькае нябачнае сонейка, якое будзе саграваць сваімі промнямі ўсё навакольле.

**Вікторыя КРУПЯНЬКОВА.**
**Фота аўтара.**

# Радыяцыя: поле для дыскусій

**ПРАБЛЕМЫ наступстваў радыяцыйных выпраменьванняў актуальныя не толькі для Беларусі. Вучоныя, якія сталі ўдзельнікамі Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Медыка-біялагічныя наступствы чарнобыльскай катастрофы», арганізаванай Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Інстытутам радыебіялогіі НАН Беларусі, прыехалі ў Гомель з Украіны, Расіі, Чэхіі, Арменіі. За два дні прачытана і абмеркавана больш за 40 дакладаў ад 150 аўтараў.**

Удзельнікі пазнаёміліся з аналізам медыцынскіх і біялагічных наступстваў чарнобыльскай катастрофы, імі дадзена радыебіялагічная характарыстыка стану біёты (гэта азначае сукупнасць відаў раслін, жывёлін і мікраарганізмаў, аб'яднаную агульнай зонай распаўсюджвання) на забруджанай радыенуклідамі тэрыторыі. Таксама навукоўцы прапанавалі новыя метады дазіметрыі, дыягностыкі і прафілактыкі хваробаў, якія выкліканы ўздзеяннем радыяцыі. На канферэнцыі разгарнуліся сапраўдныя спрэчкі наконт біялагічных эфектаў уздзеяння малых дозаў выпраменьвання. Праблема працягвае заставацца дыскусійнай, выказаны палярныя меркаванні аб іх бяспечнасці для чалавека і наваколля. Шэраг даследаванняў у гэтай галіне сведчыць, што вядомыя заканамернасці ў радыебіялогіі сёння недастатковыя для растлумачвання медыцынскіх і радыебіялагічных наступстваў чарнобыльскай катастрофы. А гэта азначае неабходнасць пошуку прынцыпова новых заканамернасцяў і механізмаў.

У выніку чарнобыльскай аварыі, якая мела характар глабальнай катастрофы, вялікія плошчы Украіны, Беларусі і Расіі былі моцна забруджаны радыенуклідамі. Усяго ў атмасферу тады трапіла каля 300 розных радыенуклідаў. След ад аварыі працягнуўся ад Фінляндыі і Швецыі да Грузіі і Турцыі, гаворыцца ў рэзалюцыі міжнароднай канферэнцыі. Наступствы чарнобыльскай катастрофы яшчэ далёка не вызначаны, але зразумела, што яна абвастрыла праблему ўплыву радыяцыі на жывыя арганізмы. Пасля абмеркавання навуковых дакладаў удзельнікі канферэнцыі прыйшлі да наступных высноў:

- Неспрыяльнае радыяцыйнае становішча прывяло да хранічнага, пралангіраванага ўздзеяння на стан усіх без выключэння кампанентаў экасістэм, біясферы ў цэлым і чалавека.
- Адным з найбольш выражаных медыцынскіх наступстваў чарнобыльскай катастрофы з'яўляецца значнае павышэнне колькасці паталогій шчытападобнай залозы.
- У асобаў, якія жывуць на забруджаных радыяцыяй тэрыторыях, рэгіструецца генетычная нестабільнасць.
- Спалучэнне павышанага радыяцыйнага фону з іншымі неспрыяльнымі фактарамі экалагічнага становішча прыводзіць да значнага павышэння верагоднасці развіцця парушэнняў сардэчна-сасудзістай і імуннай сістэм.
- Унутранае выпраменьванне здольнае індуцыраваць шэраг адхіленняў у функцыянаванні крывятворнай, эндакрыннай, рэпрадуктыўнай, імуннай, стрававальнай і нервовай сістэм арганізма.
- Адзін з асноўных кірункаў абароны насельніцтва на аддаленым этапе наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС — зніжэнне ўзроўняў паступлення ў арганізм не толькі цэзію-137, але і стронцыю-90 і трансуранавых элементаў (з сельскагаспадарчай прадукцыяй, пры спальванні забруджанай драўніны). Для чаго патрэбна ўдасканальваць сістэмы абаронных мерапрыемстваў у сельскай гаспадарцы.
- Для больш дакладнага прагнозу медыцынскіх наступстваў радыяцыйных інцыдэнтаў перспектыўным з'яўляецца шэраг новых спосабаў ацэнкі дозы выпраменьвання, а таксама ўвядзенне паняцця адноснай радыяцыйнай нагрузкі.
- Неабходна развіваць метады ранняга выяўлення пухлінных захворванняў, якія з'яўляюцца вынікам уздзеяння радыяцыйнага фактара.

Удзельнікі міжнароднай канферэнцыі адзначылі неабходнасць больш цеснага міжведамаснага і міжнароднага супрацоўніцтва, абмену інфармацыяй. Была выказана просьба да Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, міністэрстваў аховы здароў'я, адукацыі, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, па надзвычайных сітуацыях стварыць спецыяльныя дзяржаўныя навуковыя праграмы ў галіне радыебіялогіі і радыеэкалогіі. Навукоўцы лічаць неабходным, каб органы дзяржаўнага кіравання краін, якія пацярпелі ад найбуйнейшай катастрофы XX стагоддзя, падтрымлівалі фінансава навукова-практычныя пошукі, накіраваныя на мінімізацыю медыцынскіх наступстваў аварыі 1986 года.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# МІНСКІЯ ХІРУРГІ ПЛАНУЮЦЬ АСВОІЦЬ СПЛІТ-ТРАНСПЛАНТАЦЫЮ ПЕЧАНІ

**Спліт-трансплантацыю печані, калі адзін донарскі орган перасаджваецца двум рэцыпіентам, плануюць асвоіць мінскія хірургі ў 2010 годзе. Такія высокатэхналагічныя аперацыі будуць выконваць у 9-й гарадской клінічнай бальніцы.**

Як адзначыў **намеснік галоўнага ўрача па хірургічнай рабоце клінікі Алег РУМО**, артатапічныя трансплантацыі печані, калі донарскі орган перасаджваецца замест печані рэцыпіента, спецыялісты ўжо асвоілі. На працягу крыху больш за паўтара года ў бальніцы выкананы 28 такіх аперацый. У той жа час у падобным хірургічным умяшанні маюць патрэбу больш як дзве тысячы беларусаў з дыфузнымі пашкоджаннямі печані ў тэрмінальнай стадыі.

**Вольга ГРЫГОР'ЕВА, «Мінск—Навіны».**

# У 24 ЕЎРАПЕЙСКІХ КРАІНАХ ПАНДЭМІЧНЫ ВІРУС ЗАНЯЎ ДАМІНУЮЧУЮ ПАЗІЦЫЮ

Па інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, на мінулым тыдні ў Беларусі працягваўся пад'ём захваральнасці на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі: за перыяд з 19 па 25 кастрычніка ў 18 кантрольных гарадах было зарэгістравана 63 679 выпадкаў грыпу і іншых прастудных захворванняў. Такім чынам паказчык захваральнасці вырас на 20,9 працэнта ў параўнанні з папярэднім тыднем. А ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года захваральнасць беларусаў на прастуду вышэйшая на 37 працэнтаў. Самыя высокія ўзроўні захваральнасці былі зарэгістраваныя ў Пінску і ў беларускай сталіцы. Пакуль што сярод захварэлых і шпіталізаваных у стацыянары пераважаюць дзеці і падлеткі да 18 гадоў, аднак рост захваральнасці на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі адзначаецца ва ўсіх узроставых групах (сярод дарослых — на 26,5 працэнта). **І, што самае галоўнае, прыкметна актывізаваліся вірусы грыпу.** Па звестках Нацыянальнага цэнтра па грыпе, грып А быў выяўлены лабараторным шляхам у 23,2 працэнта даследаваных узораў, а грып В — у 2,4 працэнта. Такім чынам, у кожным чацвёртым выпадку захворвання на прастуду віна кладзецца менавіта на вірусы грыпу. На долю адэнавіруснай інфекцыі прыпадаюць 30,5 працэнта выпадкаў захворванняў, на парагрып — 8,5 працэнта, РС-інфекцыю — 25,6 працэнта і змешаную інфекцыю — 9,8 працэнта.

Між іншым, па звестках Еўрапейскай сістэмы эпідэміялагічнага нагляду за грыпам, эпідэмічныя працэсы актывізаваліся ўжо ў многіх краінах еўрапейскага рэгіёна. У Ісландыі інтэнсіўнасць эпідэмічнага працэсу ахарактарызаваная як вельмі высокая, у Ірландыі і Люксембургу — як высокая. Актыўна хварэюць таксама жыхары Бельгіі, Ізраіля, Ісландыі, Люксембурга, Нідэрландаў і іншых краін. Пандэмічны вірус A/H1N1 заняў дамінуючую пазіцыю ў 24 краінах еўрапейскага рэгіёна, склаўшы больш як 95 працэнтаў усіх субтыпаваных вірусаў грыпу, выяўленых за тыдзень.

У Расіі на мінулым тыдні перавышэнне эпідэмічнага парога было зарэгістравана ў 14 гарадах і 7 суб'ектах Расійскай Федэрацыі, у тым ліку ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Мурманску і Калініградзе. Па стане на аўторак было вядома аб чатырох смяротных выпадках у выніку захворвання расіян на грып A/H1N1.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Здароўе на талерцы

# ПРАВІЛЫ ПЕРАКУСУ



**ЗАМЕСТ абеду вы часта вымушаныя перабівацца бутэрбродамі? Тады наступныя рэкамендацыі дыетолагаў для вас.**

Есці на хаду шкодна перш за ўсё таму, што, перакусваючы такім чынам, вы, як правіла, спяшаецеся. А значыць, хутка адкусваеце, хутка праглынаеце, у лепшым выпадку запіваючы свой гамбургер гарбатай або кавай. У выніку першы этап няпростага працэсу стрававання застаецца прапушчаным. Заключацца ж ён павінен у старанным перажоўванні.

### Памятайце: у страўніку зубоў няма!

Гэта не проста словы. Калі вы «закідваеце» ў свой страўнік ежу, дрэнна пажаваную і не змочаную як належыць слінай, вы даяце лішнюю нагрузку на слізістую страўніка, бо ў сліне ёсць ферменты, якіх няма на іншых «паверхах» страўнікава-кішачнага тракту. Ды і з чыста смакавага пункту гледжання вы страчваеце. Правядзіце такі эксперымент: пажуйце кавалак хлеба так, як вы звычайна гэта робіце: два—тры ўкусы — і глыток вады, і так, як належыць: робячы не менш як 30 (!) жавальных рухаў. Вы адчуеце зусім іншы смак хлеба!

Другая «шкоднасць» хуткай яды. На яе звычайна траціцца не больш як 15 хвілін. Між тым у нашым мозгу ёсць так званы цэнтр насычэння, які ўключаецца толькі праз 20 хвілін пасля пачатку прыёму ежы. Калі на працягу гэтага часу есці паспешліва, не разжоўваючы, можна «закідаць» у сябе вельмі шмат ежы і пераесці. А есці спакойна ў такіх сітуацыях атрымліваецца рэдка. Між тым пры гэтай умове можна цалкам насыціцца малой колькасцю ежы. Таму, калі вы дзесьці перакусваеце, пастарайцеся расцягнуць сваю трапезу не менш чым на 20 хвілін.

### Сканцэнтруйцеся на ядзе

Урачы не рэкамендуюць падчас яды працаваць за камп'ютарам, чытаць або глядзець тэлевізар. Таму што калі на экране адбываецца штосьці цікавае, хвалюючае, то вы не заўважаеце, як у лічаныя хвіліны з'ядаеце ўсё, што трапляе пад руку. Па гэтай жа прычыне адно з правілаў добрага тону абавязвае падчас яды не высвятляць адносінаў і не абмяркоўваць рэчы, якія могуць кагосьці раздражняць. Усе сістэмы арганізма павінны быць накіраваныя на тое, каб добра засвоіць ежу. Калі пачынаецца ўзбуджэнне іншых цэнтраў, то затармажваецца харчовы цэнтр і рэзка пагаршаюцца ўсе стрававальныя працэсы.

### Пабольш агародніны і садавіны!

Як мага часцей перакусвайце агароднінай і садавіной. Яны выводзяць з арганізма лішак халестэрыну, тлушчы, канцэрагены. Калі ў вашым рацыёне штодзень будзе адна морквіна ці яблык, вы атрымаеце ўсе неабходныя для арганізма пажыўныя рэчывы.

### Вось бы гарачага...

Перакусы перакусамі, але памятайце: гарачая ежа таксама патрэбная. Хоць бы 1—2 разы на дзень есці трэба нармальна. Калі хочаце пазбегнуць язвы страўніка, гастрыту, пачынайце дзень з гарачай ежы. Асабліва гэта датычыцца тых, у каго нізкая кіслотнасць страўнікавага соку.

Калі ў кіёску хуткай ежы прадаецца суп або булён, пачніце з яго, а ўжо потым бярыце сасіску з кетчупам. Да бутэрбродаў і беляшоў абавязкова далучыце любую агародніну. І не забывайце, што сасіскі, каўбасы, вяндліна ўтрымліваюць вялізную колькасць тлушчу, солі, мноства кансервантаў, таму яны не павінны быць штодзённай ежай.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Інфарм-укол

# Матулям — пра немаўлят

**ПАСЛЯ выпіскі дзіцяці з раддома неабходна сама меней на некалькі тыдняў абмежаваць кантакты немаўляці з вялікай колькасцю дапытлівых знаёмых і сваякоў. А вось хто сапраўды павінен наведаць дзіця — літаральна на працягу першых трох дзён пасля пераезду з радзільнага ў родны дом, — дык гэта ўрач-педыятр і патранажная медсястра з дзіцячай паліклінікі па месцы жыхарства. А з асноўнымі правіламі догляду маленькага чалавечка знаёміць валеолаг 2-й Мінскай гарадской дзіцячай паліклінікі Антаніна ВАРАНЬКО.**

**Пупавіна.** Звычайна пупочная ранка зажывае на другім тыдні жыцця. А да таго часу пасля адпадзення пупочнага астатку неабходна апрацоўваць ранку стэрыльным тампонам, змочаным 5-працэнтным растворам марганцавакіслага калію або брыльянтавай зелені. Калі ранка дрэнна зажывае, скура вакол пупка становіцца чырвонай, у дзіцяці ўзнімаецца тэмпература вышэй за 37 градусаў, неабходна выклікаць урача.

**Купанне.** Памяшканне для купання павінна быць цёплым, без скразняку. Тэмпература вады — 37—37,5 градуса. Час купання з'яўляецца для дзіцяці самым прыемным момантам на працягу дня. Пасля купання дзіця трэба не церці, а прамакаць ручніком або прасцінай. Потым змазаць складкі скуры дзіцячым ласьёнам або дзіцячым крэмам. Скура дзіцяці вельмі пяшчотная, таму патрабуе вельмі ўважлівага догляду.

**Вочы.** Штодня кожнае вока неабходна праціраць асобным тампонам са стэрыльнай ваты, змочаным у гатаванай вадзе. Рухі павінны быць ад вонкавага вугла да ўнутранага.

**Спавіванне.** Спавіваць, мяняць памперсы неабходна перад кожным кармленнем. Дзіця трэба спачатку падмыць цёплай вадой. Падчас выбару памперсаў неабходна ўлічваць вагу малога, паколькі вялікі будзе працякаць.

**Прагулкі.** З даношаным дзіцем можна пачынаць гуляць з 2-тыднёвага ўзросту пры тэмпературы паветра мінус 8 градусаў. Момант пачатку прагулак з неданошаным дзіцем неабходна ўзгадніць з урачом.

**Дзіцячы куток.** Гэта яго ложак, столік для спавівання, шафа для бялізны і прадметаў догляду, купання. Усе прадметы неабходна трымаць у ідэальнай чысціні. Дзіцячыя рэчы варта мыць дзіцячым мылам, старанна прамываць, сушыць і прасаваць. У пакоі неабходна падтрымліваць аптымальную тэмпературу паветра — каля 22 градусаў і абавязкова рэгулярна яго праветрываць.

**Сон.** Нованароджаныя спяць шмат, прачынаюцца дзесьці праз 2-4 гадзіны для ўжывання ежы.

**Кармленне.** Грудное выкормліванне — каштоўнае з усіх пунктаў гледжання. Менавіта падчас гэтага працэсу паміж маці і дзіцем устанаўліваецца моцная псіхаэмацыянальная сувязь, якая захоўваецца на ўсё жыццё. Некалькі дзён пасля родаў маці корміць дзіця малозівам, якое ачышчае кішэчнік і абараняе ад інфекцыі. Пасля малозіва пачынаецца выпрацоўка «пераходнага» малака, і дзесьці праз два тыдні — спелага, сапраўднага малака. Карміць дзіця лепш за ўсё ў любы час, па патрабаванні дзіцяці.

# Адкуль у дзяцей творчая заціснутасць?

**АД нараджэння дзіця не сціснутае. Яно не ведае, што такое банальнасць, і таму смела асвойвае свет — праводзіць лініі, наносіць фарбы, стварае пластычныя формы.**

Дзеці могуць сціснуцца потым, калі на іх пачынаюць уздзейнічаць дзве «сістэмы»: закамплексаваныя бацькі і дзетсадаўскія правілы, якія вучаць маляваць або ляпіць «падобна» і «правільна». Да канца пачатковай школы ў дзіцяці нярэдка «прападае талент». Таму што школа, як правіла, не развівае, а эксплуатуе яго здольнасці. Дзіця аднаўляе адпрацаваныя шаблоны і трапляе ў тупік. Іншая перашкода творчасці — бацькоўскія амбіцыі. Калі бацькі патрабуюць ад малога поспеху, канкрэтнага выніку — быць лепей за ўсіх! — у дзіцяці цалкам атрафіруецца жаданне маляваць, музіцыраваць, прыдумваць... Самая слушная парада, якую можна тут даць бацькам, зводзіцца да простай ісціны — не ведаеце, чым дапамагчы дзіцяці, дык хоць бы не перашкаджайце яму знаходзіцца ў творчым працэсе.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

У нататнік

# Пахі дапамогуць у працы

**ЯШЧЭ са старажытнасці было вядома аб уплыве пахаў на наша здароўе. Напрыклад, у рукапісах, якія дайшлі да нашага часу, гаворыцца, што егіпецкая царыца Ніферціці выкарыстоўвала алей кмену ад стомы, прастуды і галаўнога болю.**

У Сярэднявечча падчас экзаменаў студэнты насілі вянкі з пятрушкі і мяты, каб абвастрыць памяць і хутчэй засвоіць матэрыял.

А вось нядаўнія даследаванні вучоных у галіне водаратэрапіі. Яны правялі такі эксперымент. Усталявалі ў дыспетчарскай зале аднаго з аэрапортаў дазатар пахаў. Высветлілася, што пахі прыкметна павышаюць працаздольнасць дыспетчараў: эфірны водар лімона хутка здымае стому і аднаўляе сілы, пах размарыну вяртае чалавека да рэальнасці, дапамагаючы засяродзіцца на канкрэтнай задачы.

### РУТА І ЛАВАНДА АД ГАЛАЎНОГА БОЛЮ

Самастойна таксама можна аднавіць сілы. Напрыклад, калі вы цэлы дзень працуеце за камп'ютарам, дастаткова час ад часу пакамячыць у руцэ свежую лімонную лупіну. І вы адчуеце сябе нашмат лепш.

Калі пасля працоўнага дня ў вас моцна разбалелася галава, гэта хутчэй за ўсё выклікана напружаннем мышцаў галавы і шыі. У такім выпадку варта скарыстацца гаючымі ўласцівасцямі лаванды.

Дзве кроплі лавандавага алею ўціра́йце кругавымі рухамі ў вобласць за вушамі і ў шыю з боку патыліцы. Таксама можна нанесці некалькі кропель лаванды на мяккую тканіну і зрабіць кампрэс на хворае месца.

Калі баліць галава, таксама дапаможа рута духмяная. Трэба расцерці свежае лісце руты і прыкладаць яго да ілба або да скроняў (у залежнасці ад таго, дзе засяроджваецца боль).

Пры высокай тэмпературы добра дапамагае такі сродак: у 0,5 літра вады (тэмпература 18—20°) дабаўце 4—5 кропель эфірнага алею піхты, сасны ці эўкаліпту. Намачыце ў гэтай вадкасці сурвэтку і абматайце лыткі. Вельмі хутка тэмпература знізіцца.

Ад стомы, бяссонніцы, разладжаных нерваў, дэпрэсіі існуе правераны сродак: трэба роўна месяц прысвяціць сябе заняткам водаратэрапіяй. Кожны дзень запальвайце водаралямпу з некалькімі кроплямі эфірнага алею, чаргуйце алей валяр'яну, яловы алей і алей чабору. Усе вашы нервовыя станы пройдуць.

Адператамлення дапамагае таксама сумесь з 4 кропель алею лаванды, 2 кропель алею лімона і 1 кроплі алею герані.

Бяссонніцу можна лячыць таксама сумессю алею герані (4 кроплі), лаванды (2 кроплі), рамонку (2 кроплі).

### ЦУДОЎНЫЯ ВОДАРЫ

У розных водараў рознае ўздзеянне на чалавека.

- Лімон уздымае настрой, супрацьдзейнічае стоме і неспакою.
- Апельсін дапамагае сагрэцца і стварае адчуванне непасрэднасці.
- Мята дапамагае пазбавіцца ад разумовай стомы і хаосу думак.
- Сандал узвышае дух.
- Сасна ўмацоўвае і ачышчае.
- Вербена заспакойвае.
- Язмін змякчае эмацыйныя перажыванні.
- Базілік лечыць мігрэнь і ўзбадзёрвае.
- Алей ядлоўцу не толькі асвяжае паветра ў памяшканні, але і дэзынфікуе яго. Можна напоўніць празрыстую шклянку ягадамі ядлоўца, а зверху паставіць свечку. Награваючыся, ядловец будзе выдзяляць ледзь улоўны пяшчотны водар.

**Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.**

# Зіма пачынаецца!!!



*У сталіцы пачала працаваць першая лядовая пляцоўка. Наведвальнікаў прыняў каток са штучным пакрыццём каля Палаца спорту.*

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**

Сам сабе псіхолаг

# Вышэй носа не скочыш?

**ВЫШЭЙ носа не скочыш, сцвярджае старадаўняя прымаўка. Псіхолагі ж вылучаюць з'яву, якую называюць «узроўнем прэтэнзій». І адзначаюць, што далёка не заўсёды чалавек можа аб'ектыўна ацаніць свае здольнасці і вызначыць для сваіх жаданняў і дамаганняў рэальны ўзровень. Безумоўна, варта імкнуцца да лепшага, але пры гэтым не трэба страчваць здольнасць цвяроза мысліць.**

Псіхолагі папярэджваюць, што завышаны ўзровень прэтэнзій можа прывесці да дэпрэсіўных станаў, а ў асабліва ўражлівых асобаў нават да душэўнага расстройства. Апынуўшыся «не ў сваёй каляіне», чалавек можа патраціць большую частку жыцця і сілаў толькі на тое, каб урэшце ўсвядоміць — гэты шлях не яго, няхай нават ён вельмі прывабны.

Таму «душазнаўцы» раяць, **па-першае,** старацца яшчэ ў адносна маладыя гады аб'ектыўна ацаніць свае здольнасці і выбраць тую дарогу, адолець якую будзе вам пад сілу.

**Па-другое,** не варта, робячы распаўсюджаную памылку, заўважаць вакол сябе толькі знакамітасцяў. Бо зорак эстрады і экрана ў свеце ўсё ж менш, чым людзей паспяховых, але не надта вядомых. Можа, лепш арыентавацца на іх?

**Па-трэцяе,** псіхолагі нагадваюць, што да канструктыўнай крытыкі варта ставіцца аб'ектыўна. Калі вы напісалі дваццаць кніг і даслалі іх у дзве сотні выдавецтваў, але адусюль атрымалі адмову, то верагодней за ўсё, на жаль, вы не «непрызнаны геній», а проста чалавек без літаратурнага таленту. Ну а калі талент усё ж ёсць, і крытыка пазітыўная, то неабходна да яе прыслухоўвацца, а не адмахвацца, лічачы яе вынікам зайздрасці.

**І па-чацвёртае.** Зразумела, варта спрабаваць, рызыкаваць, шукаць, старацца дасягнуць поспеху, выкарыстоўваючы для гэтага ўсе наяўныя ў вашым распараджэнні сродкі. Але калі на працягу пяці-шасці гадоў прасоўванне ідзе па прынцыпе «крок наперад, два крокі назад», тады сапраўды трэба спыніцца, паглядзець на сябе збоку і перагледзець свае жаданні, прывёўшы іх у адпаведнасць з магчымасцямі.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Нефармат

# МЯЖА, ЯКАЯ ПРАХОДЗІЦЬ ПРАЗ СЭРЦА

**ВЯСНОЙ калега распавяла цікавую гісторыю пра тое, як кожны дзень з Дабранкі ў Паддабранку, што па сутнасці з'яўляецца двума канцамі адной вёскі, ходзіць у школу дзяўчынка са сваёй маці. Усё б нічога. Але Дабранку з Паддабранкай раздзяліла цяпер дзяржаўная мяжа Беларусі з Украінай. І кожны дзень, нават двойчы на дзень, яны, дарослая і малая, праходзяць працэдуру пашпартнага кантролю. Усе службовыя асобы тамтэйшага пункту пропуску з двух бакоў ведаюць іх, але дакументы ўсё адно правяраюць. Таго вымагаюць правілы.**

І хоць перыядычна на высокіх узроўнях розных краін-суседак узнікаюць пытанні аб спрошчаным парадку перасячэння мяжы для насельніцтва памежных зонаў, дэманструюцца намеры многае зрабіць для людзей, насамрэч нават так званая спрошчаная працэдура далёка не простая. Хіба нельга было б выдаць які-небудзь пропуск нашым гераіням накшталт праязнога білета на пэўны тэрмін, які б і правяраўся выбарачна? Як і для тых людзей, што не могуць паехаць да родзічаў у суседнюю вёску за паўкіламетра напрасткі, а вымушаны шыбаваць на пункт пропуску, нават калі запаветны шлагбаум — у суседнім раёне за 50 кіламетраў ад населенага пункта. Але шлагбаум, гаворка ідзе пра беларуска-ўкраінскую мяжу, існуе для законапаслухмяных людзей. Міліцэйскія зводкі ледзь не кожны дзень папаўняюцца інфармацыяй пра тое, як ляснымі сцяжынамі вывозіцца разнастайны кантрабандны тавар. На хутарах, у закінутых пабудовах ды і жылых дамах грамадзян абсталёўваюцца перавалачныя базы гэтай самай кантрабанды. А тое, што затрымліваецца і трапляе ў зводкі, ці не дзясятай часткай даводзіцца сапраўдным маштабам памежнай кантрабанды. Уся справа ў розніцы цэнаў. І пакуль тая розніца будзе даваць нагоду зарабіць, людзі будуць знаходзіць магчымасць абысці афіцыйныя пераходы.

Усе сродкі інфармацыі не так даўно дружна паведамілі пра кур'ёзныя выпадкі з маладымі мужчынамі на брэсцкіх памежных пераходах. Адзін з іх нацягнуў пад навгавіцы многа жаночых панчох, другі абкруціў торс бюстгальтарамі. Рабілася гэта, каб падмануць пільнасць мытнікаў. Вядома, інфармацыя пра тых гора-кантрабандыстаў выклікала смех. А вось адзін з брастаўчан напісаў у інтэрнэце, што смяёмся над сабой, бо не ад добрага жыцця ідуць людзі на свядомае прыніжэнне сваёй годнасці. Сапраўды, чалавек нічога не краў, купіў рэчы за свае грошы... але не задэклараваў тавар, як таго патрабуюць правілы. Ды тут што? Ну забралі тыя лішнія панчохі ці прадметы бялізны. І калі маладыя людзі тавар спрабавалі схаваць, значыць, ведалі правілы і маглі ацаніць ступень рызыкі.

Гісторыя, што здарылася на мяжы з жыхаром Драгічынскага раёна, наклікала бяду на яго сям'ю. Звычайны вясковы працаўнік, які праблем з законам ніколі не меў, гнаў машыну з Германіі. Раней многія ездзілі ў гэту краіну за патрыманымі іншамаркамі. Машыну патрэбную знайшоў, дакументы належныя аформіў, а ў якасці шопінгу зазірнуў у паляўнічую краму, бо заўсёды быў аматарам палявання, меў членскі білет таварыства і зарэгістраваную зброю. Уразіла цана патронаў да паляўнічай стрэльбы: яна была ўдвая меншай, чым у нас. Купіў два пачкі, кінуў у машыне на сядзенне, не хаваў, бо ў галаву не прыйшло, што патроны будуць разглядацца як боепрыпасы, забароненыя для перавозу праз мяжу. Ніхто потым не ўзяў да ўвагі яго няведанне і неабачлівасць. І амаль тры гады, праведзеныя на зоне, сталі расплатай для яго і яго сям'і за няведанне радка з правілаў.

Летам у Ганцавічах мне расказалі гісторыю, якая каштавала шмат нерваў жыхарцы райцэнтра. Яе былы муж жыве ў Англіі. Абое яны, як людзі інтэлігентныя, падтрымліваюць цывілізаваныя адносіны перш за ўсё на карысць сына. Дык вось бацька паклікаў сына на адпачынак і прыслаў адпаведнае ўсім правілам запрашэнне. Яна таксама хутка сабрала дакументы, у стосе якіх ляжаў яе дазвол на выезд сына, адкрыла візу хлопчыку, купіла білет, і ў прызначаны час яны прыбылі з сынам ў мінскі аэрапорт. Там дакументы праверылі і вярнулі... за адсутнасцю дазволу бацькі на выезд сына з Беларусі. Спачатку ў яе была істэрыка. Супакоіўшыся, яна пабегла па ўсіх начальніках службаў, спрабуючы давесці, што ў гэтым няма логікі: бацька прыслаў запрашэнне, ён чакае там, які можа быць яшчэ дазвол ад яго? Ёй тыцкалі пад нос нейкую паперу, а разважаць на тэмы логікі ніхто не выказваў жадання. Карацей, білет давялося здаваць і ехаць дадому, у Ганцавічы. Дарэчы, гэту норму, якая патрабуе дазволу двух бацькоў на выезд дзіцяці, нядаўна адмянілі. А на пачатку лета яна яшчэ дзейнічала.

Вось яшчэ адна з характэрных непрыемнасцяў, якая можа здарыцца на мяжы. Колькі гадоў таму наняты ў турфірме аўтобус ажыццяўляў шоп-тур з Брэста ў Хмяльніцкі. Пасажырам таго аўтобуса была аўтар гэтых радкоў. Выязджалі з горада лістападаўскім вечарам, каб прыбыць на месца раніцай. На пункце пропуску Макраны, што за шэсцьдзесят з лішкам кіламетраў ад Брэста, праверылі дакументы. Высветлілася, што адной дзяўчыне днём раней споўнілася 25 гадоў, а значыць, яе пашпарт стаў несапраўдным. Яе высадзілі холадам, цемрай, ніякі транспарт ужо не хадзіў. Добра, калі за ёй было каму прыехаць.

Падобныя гісторыі можна прыводзіць дзясяткамі. Пра тое, як рыбалка на возеры, па якім праходзіць мяжа ў Іванаўскім раёне, каштавала хлопцу ў Мінску працы. Украінскія памежнікі забралі нашых рыбакоў у камендатуру, пакуль суд, працэдура дэпартацыі, іншыя фармальнасці, прайшло тры дні. А працадаўца не пажадаў лічыць прычыны прагулу ўважлівымі і выдаў разлік. Як столінскі ляснік, што заблудзіўся ў лесе, і выпадкова перайшоў мяжу, ледзь не памёр. Бо ў яго здарыўся прыступ апендыцыту, а тамтэйшыя памежнікі палічылі яго за звычайнага парушальніка, сталі высвятляць асобу, пры гэтым не спяшаліся... Словам, украінскія ўрачы, якія зрабілі аперацыю, гаварылі, што ў кашулі нарадзіўся, бо лік ужо ішоў на хвіліны. Пра тое, як адзін камандзір заставы, вельмі прынцыповы, патрабаваў, каб даяркі на дзённую дойку ў поле хадзілі з пашпартамі, бо навокал памежная зона.

Усе прыведзеныя выпадкі датычацца людзей звычайных, нармальных, а не патэнцыяльных злачынцаў, кантрабандыстаў і парушальнікаў, ад якіх нас заклікана абараніць мяжа. Вядома, што яна з'яўляецца кардонам, заслонай для многіх крымінальных элементаў, груповак і сіндыкатаў. І сваю задачу выконвае. Але да лозунгаў, якія час ад часу прамаўляюць палітыкі, накшталт таго, што межы павінны аб'ядноўваць людзей, а не раздзяляць іх, пакуль далёка, як да неба. Я жыву на мяжы трох краін: Беларусі, Польшчы, Украіны. У Польшчы апошні раз была паўтара года таму па працы, а Украіну наведвала гады два таму, каб зрабіць сякія-такія пакупкі. Не скажу, што з-за мяжы не вылазяць мае знаёмыя. Складана ўсё гэта. У Польшчу віза каштуе 60 еўра, ва Украіну візы не трэба, але не кожнаму падабаецца стаянне ў чэргах на мяжы, ды і працэдура стасункаў са службовымі асобамі. Хоць і праяўляюць яны тактоўнасць, што, патрабуе інструкцыя, але ў кожным бачаць патэнцыяльнага парушальніка, як патрабуе ад іх другая інструкцыя, і з гэтым нічога не зробіш. Чым часцей сутыкаешся з мяжой у розных яе праявах, тым болей хочацца верыць, што чалавецтва будзе развівацца ў бок скасавання межаў, як зрабілі гэта ў Еўрасаюзе.

Некалі па ўсесаюзным тэлебачанні паказвалі рэпартаж пра доблесных вартавых мяжы, чамусьці запомнілася яго назва «Мяжа, якая праходзіць праз сэрца». А можа ўспомнілася тады, як давялося глядзець другі рэпартаж ужо мясцовага тэлебачання: жанчына з вёскі Тамашоўка Брэсцкага раёна паказвала на горад Уладаву, цяпер польскі горад. Расказвала, што там жывуць яе сваякі, горад добра відаць з тамашоўскага ўзгорка, адлегласць да яго кіламетры два. А да сваякоў не сходзіш. Вось тут ужо зручней пра мяжу сказаць булгакаўскім выслоўем як пра іголку, што захрасла ў сэрцы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Рэзананс

## «ЭКСТРЫМ-ВАНДРОЎКА НА ПРЫСТАНЬКУ»

**Пад такой назвай 22 верасня г.г. у «Звяздзе» быў змешчаны крытычны артыкул аб дрэннай дарозе да адной з мясцінаў, якая звязана з маладымі гадамі Якуба Коласа. Матэрыял быў накіраваны ва ўпраўленне культуры Мінаблвыканкама.**

Як паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінаблвыканкама С.А. Баранок, упраўленне культуры сумесна са Стаўбцоўскім райвыканкамам разгледзела артыкул «Экстрым-вандроўка на Прыстаньку» аб добраўпарадкаванні мястэчка Прыстанька Стаўбцоўскага раёна.

Установамі культуры раёна праводзіцца пэўная работа па ўшанаванні падзей, звязаных з жыццём і дзейнасцю Якуба Коласа. Так, у 1990 годзе аддзелам культуры распрацавана раённая праграма «Спадчына», у адпаведнасці з якой усталяваны памятныя знакі па ўвекавечанні памяці вядомых землякоў Наднёманскага краю, у тым ліку і памятны знак Якубу Коласу ў мястэчках Цёмныя Ляды і Прыстанька. Ва ўрочышчы Прыстанька размешчаны камень з надпісам «Тут у 1907 годзе адбыўся нелегальны з'езд настаўнікаў Беларусі з удзелам Якуба Коласа». Стаўбцоўскім райвыканкамам быў арганізаваны выезд у мястэчка Прыстанька прадстаўнікоў раённага Савета дэпутатаў, райвыканкама, раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў аховы навакольнага асяроддзя і іншых зацікаўленых.

Вызначана, што тэрыторыя мястэчка знаходзіцца ў здавальняючым стане. Будаўніцтва аўтамабільных дарог не плануецца ў сувязі з тым, што гэта можа парушыць наяўную экасістэму і знізіць прывабнасць прыроднага ландшафту. У мэтах захавання і папулярызацыі адметнай мясціны Стаўбцоўскім раённым выканаўчым камітэтам плануецца ўключыць мястэчка Прыстанька ў пешы і веламаршрут.



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества

| | |
|---|---|
| **Лот № 1: Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке** | Не завершенная строительством экспериментальная фабрика спортивной одежды, в том числе производственный корпус, административно-бытовой корпус, котельная, трансформаторная подстанция, расположенная по адресу: Гродненская область, Берестовицкий район, г. п. Большая Берестовица, и право заключения договора аренды четырех земельных участков общей площадью 6,1218 га сроком на 50 лет. Продажа объектов недвижимости по лоту № 1 производится на условиях и в порядке, определенных Указом Президента Республики Беларусь от 27 февраля 2007 г. № 108 «О некоторых мерах по вовлечению в хозяйственный оборот неиспользуемого государственного имущества» с установлением начальной цены продажи равной одной базовой величине, определенной законодательством |
| **Начальная цена предмета аукциона – 100 594 915 руб., сумма задатка – 10 000 000 руб.** | |
| **Продавец недвижимого имущества:** Учреждение «Республиканский центр олимпийской подготовки конного спорта и коневодства», контактные телефоны: (8 0175) 02 20 50, 02 20 59 | |
| **Сведения об объектах недвижимости: Производственный корпус** – одноэтажный, сборный из легких металлических конструкций, площадью 8 051 кв. м, стены из металлических панелей с утеплителем из пенополиуретана, кровля – металлический профнастил, утеплитель – стяжка с битумно-рубероидным покрытием, перегородки – сборный ж/бетон; дата начала и окончания строительства: 1990 г. – 1994 г., степень готовности 48 %. **Административно-бытовой корпус** – трехэтажный с пристроенной одноэтажной столовой, площадью 4 911 кв. м (в том числе: помещения АБК – 4 032 кв. м, столовая – 879 кв. м); каркас (колонны, ригеля, плиты перекрытия и покрытия), внутренние стены – из сборного ж/бетона; наружные стены – из керамзитобетонных панелей и силикатного кирпича; дата начала и окончания строительства: 1990 г. – 1994 г., степень готовности 58 %. **Котельная** – выполнена вертикальная планировка, отсыпана подъездная дорога; залиты фундаменты под дымовую трубу, котлы и колонны; выкопан котлован под мазутное хозяйство; дата начала и окончания строительства: 1990 г. – 1991 г. **Трансформаторная подстанция с внеплощадочными сетями:** здание РП совмещенное с ТП10(6) кВ – одноэтажное, кирпичное, высотой 5 м, размером в плане 9х14 м; сеть канализационная ливневая из безнапорных асбестоцементных труб протяженностью 150 п. м; сеть канализационная производственная из керамических труб протяженностью 444,2 п. м; сеть водопроводная из полиэтиленовых труб протяженностью 290,7 п. м, дата начала и окончания строительства: 1990 г. – 1992 г. | |
| **Условия использования недвижимого имущества:** завершение строительства объекта в течение 3 лет после заключения договора купли-продажи; осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте в течение 5 лет с момента ввода объекта в эксплуатацию; создание и сохранение в течение 5 лет численности рабочих мест, определенных бизнес-планом развития производства; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи | |
| **Условия использования земельных участков:** возмещение расходов, связанных с государственной регистрацией прекращения прав у землепользователя на земельный участок, изъятый у него для проведения аукциона; получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ в случае изменения функционального назначения объекта; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; **ограничения по использованию земельных участков:** с кадастровым № 420455100001001019 – по перечню № 5 в охранных зонах линий, сооружений связи и радиофикации площадью 0,0662 га и № 7 в охранных зонах коммунальных водопроводов и канализации площадью 0,0662 га; с кадастровым № 420455100001001017 – по перечню № 5 в охранных зонах линий, сооружений связи и радиофикации площадью 0,0262 га и № 7 в охранных зонах коммунальных водопроводов и канализации площадью 0,0231 га; с кадастровым № 420455100001001020 – по перечню № 6 в охранных зонах линий электропередачи напряжением до 1000 вольт площадью 0,0088 га; с кадастровым № 420455100001001018 – по перечню № 5 в охранных зонах линий, сооружений связи и радиофикации площадью 0,0100 га и № 7 в охранных зонах коммунальных водопроводов и канализации площадью 0,0100 га | |
| **Лот № 2: Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке** | Капитальное строение инв. № 410/С-2353, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Волковыск, ул. Зенитчиков, д. 37, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 420850100001008561 площадью 0,0398 га сроком на 50 лет |
| **Начальная цена предмета аукциона – 77 919 063 руб., сумма задатка – 7 791 000 руб.** | |
| **Продавец недвижимого имущества:** Гродненское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Гродноэнерго», контактные телефоны: (8 0152) 79 21 77, 79 21 41 | |
| **Сведения об объектах недвижимости:** здание нежилое одноэтажное 1964 г. с тремя пристройками 1979 г., общей площадью 208,9 кв. м | |
| **Условия использования недвижимого имущества:** вовлечение в хозяйственный оборот в течение 1 года с момента заключения договора купли-продажи | |
| **Условия использования земельного участка, ограничения по использованию:** использование земельного участка под здания административного назначения, магазины, швейные производства; получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработка строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации права на земельный участок | |
| **Лот № 3: Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке** | Капитальные строения инв. №№ 420/С-5363, 420/С-5366, 420/С-5984, 420/С-5985, многолетние насаждения инв. №№ 01992415–01992461, оборудование в кол-ве 39 ед., расположенные по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, дер. Горни, ул. Полевая, 21, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423685402123000024 площадью 1,4530 га сроком на 50 лет |
| **Начальная цена предмета аукциона – 180 644 050 руб., сумма задатка – 18 064 000 руб.** | |
| **Продавец недвижимого имущества:** Государственное лесохозяйственное учреждение «Лидский лесхоз», контактные телефоны: (8 01561) 4 27 50, 4 26 54 | |
| **Сведения об объектах недвижимости:** инв. № 420/С-5363: здание цеха по переработке мелкотоварной древесины 1980 г. площадью 842,5 кв. м; ворота деревянные 2005 г. площадью 16 кв. м; забор из металлической сетки на ж/б столбах 1980 г. площадью 804 кв. м; забор деревянный 2005 г. площадью 63 кв. м; площадка асфальтная 1980 г. площадью 1724 кв. м; инв. № 420/С-5366: здание бытовых помещений1982 г. площадью 87,3 кв. м; инв. № 420/С-5984: водопроводная сеть стальная 1982 г. протяженностью 120,58 п. м; инв. № 420/С-5985: кабельная линия 0,4 кВ 1980 г. протяженностью 81 м; многолетние насаждения – 47 ед.; деревообрабатывающее и электротехническое оборудование в кол. 39 инв. номеров | |
| **Условия использования недвижимого имущества:** осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте, создание им дополнительных рабочих мест в течение 2 лет с момента заключения договора купли-продажи | |
| **Условия использования земельного участка, ограничения по использованию:** использование по целевому назначению; получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ в случае изменения функционального назначения объекта; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; ограничения по перечню № 6 в охранных зонах линий электропередачи напряжением до 1000 вольт площадью 0,0527 га | |
| **Организатор аукциона:** Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул.17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней) | |

1. Аукцион состоится **30 ноября 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, к участию в нем допускаются: по лоту № 1 – негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели; по лотам №№ 2, 3 – граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона по **26 ноября 2009 года до 13.00** по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, кабинет 6.

**К заявлению прилагаются следующие документы:**

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549;
- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия. Представителям юридических лиц просьба иметь при себе учредительные документы.

4. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения; имеет право снять предмет аукциона с аукциона в любое время до объявления его проданным.

6. Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся, если:

- заявление на участие в нем по конкретному предмету аукциона подано менее чем двумя участниками;
- ни один из его участников после трехкратного объявления первой цены не поднял аукционный номер;
- ни один из его участников в соответствии с решением комиссии по проведению аукциона не был признан победителем.

7. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (далее – претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

8. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

9. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

10. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

11. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, в рублях; победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа. Срок оплаты недвижимого имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

12. В случае невыполнения условий продажи объекта приобретателем имущества договор купли-продажи расторгается в одностороннем порядке без компенсации затрат.


КІРМАШНЫ ДЗЕНЬ

## ЗІМУ КОРМІЦЬ



По ўсёй краіне традыцыйна працуюць восеньскія кірмашы сельгаспрадукцыі. Арганізоўваюць масавыя сезонныя продажы ў розных месцах, бо важна, каб усе ахвотныя змаглі зрабіць запасы на зіму бліжэй да свайго дому. Самыя запаслівыя ўжо ацанілі шырокі асартымент прадукцыі: бульба і капуста, морква і цыбуля, яблыкі, кавуны, агуркі і памідоры, журавіны, мёд і шмат іншага. Але трэба памятаць, што работа такіх кірмашоў заканчваецца ў найбліжэйшыя выхадныя. Так што ўсе — па запасы, бо хто восенню не патурбуецца пра гэта, зімой і вясной будзе плаціць даражэй.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




## ПЕРАПІС ЗАКОНЧЫЎСЯ — ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА



**Калі ў нашым пад'ездзе перапісвалі жыхароў, мяне не было дома, а пайсці на перапісны пункт не выпадала.**

Але пасля выхадных, калі перапіс насельніцтва закончыўся, мне патэлефанавалі і папрасілі зазірнуць на ўчастак № 20 і запоўніць анкету.

Шчыра кажучы, чакаў, што не будзе бланкаў на беларускай мове, што перапісчыкі не ведаюць, дзе напісаць «ў». Але аказалася, што бланкі ёсць і са мною па-беларуску размаўляла Ірына Будкевіч. Падумаў, што жанчына, магчыма, выкладае беларускую мову і літаратуру, а высветлілася, што працуе інжынерам на Баранавіцкім заводзе аўтаматычных ліній.

І гэта была першая прыемная нечаканасць.

У пакоі знаходзіліся яшчэ некалькі жанчын — калегаў І. Будкевіч па перапісе. І было цікава даведацца, ці многія жыхары на іх участку прызнавалі беларускую мову роднай. Вынікі перапісу будуць абнародаваны праз два гады, а тут ёсць магчымасць пачуць, якое ўражанне склалася па гэтым пытанні ў тых, хто непасрэдна займаўся перапісам.

Другім сюрпрызам было тое, што беларуская мова ўсё ж для большасці насельніцтва застаецца роднай. Чалавек кажа, што беларуская — родная, а размаўляю на рускай. І гэта адпавядае сапраўднасці. Усё далейшае залежыць толькі ад нас.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

## МЕДКАМІСІЯ БЕЗ... АГЛЯДУ

**Паводле інфармацыі старшага памочніка пракурора Гродзенскай вобласці Вячаслава Ігнаціка, увайшоў у сілу прыгавор суда Кастрычніцкага раёна абласнога цэнтра ў дачыненні да шэрагу медработнікаў гарадской паліклінікі № 5.**

У 2007—2008 гадах яны за плату выдавалі вадзіцелям даведкі аб допуску іх да кіравання транспартнымі сродкамі. Рабілася гэта ад імя медкамісіі, аднак без правядзення медыцынскага агляду. Загадчыца аддзялення і тэрапеўт асуджаны за атрыманне хабару паўторна і службовы падлог на пяць гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Акрамя таго, ім забаронена займаць пасады, звязаныя з выкананнем юрыдычна значных дзеянняў, тэрмінам на пяць гадоў. Старшая медсястра атрымала тры гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Два гады правядзе ў такой жа ўстанове і санітарка, якую прызналі вінаватай у пасрэдніцтве пры хабарніцтве. Незаконна атрыманыя грошы спагнаныя ў даход дзяржавы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# Сувораўцы маюць дрэнны апетыт толькі пасля... матулінай ежы

**НАЧАЛЬНІК Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча генерал-маёр Мікалай Скобелеў сустрэўся з журналістамі, паказаў, як жывуць суворауцы, а таксама адказаў на пытанні. Па яго словах, зараз у вучылішчы 65—70 % з 471 навучэнца складаюць хлопцы-сіроты, дзеці загінулых вайскоўцаў і з няўдалых сем'яў. Сёлета конкурс на адно месца сярод тых, хто паступіў у 8-ы клас, быў 7 чалавек на месца, а ў 7-ы клас — 4 чалавекі на месца. Каб стаць суворауцам, хлопцам трэба было прайсці псіхалагічны адбор, медыцынскі агляд, а таксама здаць матэматыку і напісаць дыктоўку.**

Начальнік суворауская вучылішча згодны, што дзецям спачатку вельмі цяжка адвыкаць ад хатніх умоў і прызвычайвацца да новых парадкаў:

— Вядома ж, дзеці ў такім узросце (12—13 гадоў) прывыклі жыць дома. І для кожнага дзіцяці пасля хвілін радасці ад выкананай першай у жыцці сур'ёзнай задачы па паступленні пасля прыбыцця ў вучылішча наступае перыяд прывыкання да цалкам новага становішча. І хлопцам сапраўды цяжка. Безумоўна, мы сочым за працэсам і робім намаганні, каб гэты працэс прайшоў як мага больш бязбольна. Хлопцы кругласутачна знаходзяцца пад увагай афіцэраў-выхавальнікаў, псіхолагаў. Мы вызначаем групу хлопцаў, якія найбольш цяжка ўцягваюцца ў наш рэжым, і з імі практычна штодзённа вядзецца праца псіхолагаў. Практычна ўсе выхадныя першай чвэрці хлопцы праводзяць дома, каб яны разумелі, што ў вучылішча яны прыйшлі свядома, што сям'я працягвае пра іх клапаціцца, маці па-ранейшаму турбуецца за іх. І мы з задавальненнем адзначаем, што хлопцаў, якія б адразу катэгарычна адмовіліся вучыцца, проста няма. Праўда, у мінулым годзе аднаго суворауца адлічылі з-за нежадання вучыцца, у пазамінулым годзе — аднаго. Але, праўда, той потым вярнуўся і моцна прасіў, каб назад узялі, але, на жаль, правілы нам забараняюць вяртаць, — расказвае Мікалай Скобелеў.

Мікалай Вітальевіч лічыць, што ў вучылішча павінна быць цеснае ўзаемадзеянне з бацькамі суворауцаў. Менавіта для гэтага праводзяцца бацькоўскія сходы, дні адчыненых дзвярэй і гэтак далей:

— Бацькі ў поўным аб'ёме інфармаваныя пра ўмовы знаходжання дзяцей, і калі ў бацькоў узнікаюць якія-небудзь пытанні, то заўсёды іх запрашаем, разам глядзім. Скаргаў на ўмовы або харчаванне ў нас даўно не было. Што датычыцца харчавання, то чатыры разы на дзень хлопцы з вялікім задавальненнем наведваюць сталоўку. А дрэнна ядуць толькі адзін раз — гэта ў панядзелак раніцай, пасля звальнення, — усміхаецца Мікалай Скобелеў. — Вядома, што апетыт у іх пасля матулінай ежы меншы, але потым усё наладжваецца.

Дарэчы, у Мінскім суворауcкім вучылішчы пакрысе адыходзяць ад практыкі, што звальненне трэба заслужыць:

— Мы адмаўляемся ад таго, каб звальненне было галоўным стымулам вучобы і дысцыпліны нашых хлопцаў. Бо як паказвае практыка, усёткі мы павінны вучыць на іншым. Мы будуем сваю працу такім чынам, каб хлопцы, наадварот, імкнуліся да нас у выхадныя дні, а не дадому. Гэта зрабіць складана. Але выхаваўчыя мерапрыемствы, культурна-забаўляльная праца, спартыўныя мерапрыемствы, суворауcкія балі прыцягваюць хлопцаў. Пасля таго як мы абнавілі цір, матэрыяльную базу кабінета гульнявой падрыхтоўкі, правялі рамонт спартзалы, у нас запрацавала літаратурная гасцёўня, хлопцам тут стала больш цікава, больш весела. Але і ў звальненні, вядома ж, ходзяць, бо бацькі працягваюць іх выхоўваць, сямейнае выхаванне дапаўняе наша, — расказаў начальнік суворауская вучылішча і дадаў, што пазбаўленне звальненняў таксама, бывае, здараецца з-за дрэннай вучобы або дысцыпліны.

Ёсць у суворауцаў і доступ у інтэрнэт. Патрапіць туды можна з камп'ютараў у бібліятэцы або вучэбных класаў, аднак пад кантролем выкладчыкаў:

— Дбаем, каб выхад у інтэрнэт быў разумным, каб яны бралі адтуль тое, што трэба. Бо ў інтэрнэце, як разумееце, вельмі шмат чаго карыснага, патрэбнага і нават неабходнага, але калі падлетак будзе там сам-насам, то ён знойдзе там іншае, забароненае, больш цікавае, таму стараемся, каб яны бралі толькі тое, што неабходна, — лічыць Мікалай Скобелеў.

Сам Мікалай Скобелеў працуе ў Мінскім суворауcкім вучылішчы з 2005 года і кажа, што з таго часу ніякіх змен у новых пакаленнях хлопцаў ён не заўважыў — яны аднолькавыя і па ўзроўні развіцця, і па ведах, і па медыцынскіх паказчыках. Адзінае толькі, што адрозніваюцца гарадскія і вясковыя хлопцы:

— Гарадскія хлопцы па ўзроўні ведаў выдзяляюцца, а хлопцы з рэгіёнаў — па ўзроўні выхавання, працавітасці, разумення жыцця.

Цікава, што цяпер у суворауcкім вучылішчы вучыцца Аляксей Сувораў. Аднак Мікалай Скобелеў кажа, што стаўленне да гэтага хлопца такое ж, як і да ўсіх астатніх, што ён не першы з такім прозвішчам у вучылішчы і што, наадварот, такое прозвішча толькі дадае адказнасці за навучанне. І каб не выдзяляць суворауца з прозвішчам Сувораў, Мікалай Вітальевіч нават не прызнаўся, на якім курсе ён вучыцца.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**



Формула ўдачы

## ПАРАЗУМЕННЕ ПА-ІТАЛЬЯНСКУ

### У беларускай оперы гучаць замежныя галасы!

**На прэм'еры оперы Вердзі «Трубадур» партыю Манрыка спяваў італьянскі тэнар Серджыя Панаджыа. Гэта стала сюрпрызам для беларускіх аматараў оперы. Аднак артыст «спеўся» з нашай Анастасіяй Масквіной, якая выйшла на сцэну ў ролі яго каханкі Леаноры. Шчыра кажучы, незразумела, што гераіня знайшла ў гэтым Манрыка, чаму не выбрала Графа ды Луна?.. Каб знайсці адказы, варта пачытаць праграмку.**

Таму што новы спектакль Вялікага тэатра оперы і балета ідзе на італьянскай мове — гэта «экспартны» варыянт оперы, якая паедзе на гастролі ў Галандыю. Менавіта гэтай звышзадачай можна патлумачыць запрашэнне двух італьянскіх тэнараў — Серджыя Панаджыа і Джавані Манфрына.

Іх з'яўленнем у спектаклі тэатр абавязаны імпрэсарыё. Спадар Супіз, аўтар праекта, запрасіў у якасці салістаў спевакоў, якія з'яўляюцца «вольнымі мастакамі» і выступаюць па запрашэнні ў розных тэатрах Італіі, кажуць, нават у Ла Скала даводзілася спяваць. Патрэба прыцягнення вакальных сілаў звонку ў наш тэатр, відаць, была прадыктаваная жаданнем рэжысёра, якая рабіла спектакль у стылістыцы фільмаў «нуар» — сярэдзіна мінулага стагоддзя, бандыцкія «разборкі», мафія... Безумоўна, трэба каб у такім спектаклі было нешта сапраўды італьянскае.

Праўда, была магчымасць паслухаць італьянцаў у беларускай оперы на прэм'еры. Бо пасля гастроляў трупа вернецца хутчэй за ўсё без італьянскіх Манрыка, а іх месца зоймуць беларускія артысты. Прынамсі, у праграмцы пазначаны яшчэ адзін выканаўца гэтай партыі — заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Сяргей Франкоўскі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

